

ПА ПУХЛІНЕ – З ЯДЗЕРНАЙ ПУШКІ

6

ШЧЫРА, ЖЫЦЦЯРАДАСНА, З ПРАЦЯГАМ

16




Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

13 СНЕЖНЯ 2023 г.
СЕРАДА
№ 241 (30121)

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ


## ЦЫТАТА ДНЯ



**Юрый НАЗАРАНКА, першы намеснік міністра ўнутраных спраў:**

*«Рэспубліку чакаюць найважнейшыя грамадска-палітычныя падзеі. Мы павінны зрабіць усё, каб не дапусціць дэстабілізацыі абстаноўкі. І для гэтага ўжо цяпер разліваюцца сілы і сродкі, падрыхтоўваюцца рашэнні аб ахове грамадскага парадку. Упэўнены, міліцыянеры са сваімі задачамі справяцца, прадэманстраваўшы прафесіяналізм, смеласць, рашучасць».*

## КОРАТКА

- **Культурная сталіца Беларусі ў 2024 годзе пераедзе са Слуцка ў Бялынічы.**
- Беларуская чыгунка з 12 да 22 снежня праводзіць акцыю «Дзеці і бяспека».
- **БДПУ і педуніверсітэт Кітая падпісалі пагадненне аб супрацоўніцтве па праграмах студэнцкага абмену.**
- Пуцін падпісаў закон аб ратыфікацыі пагаднення з Беларуссю па адтэрміноўцы пагашэння доўгу па дзяржкрэдытах.
- **Белгідрамет: на рэках Беларусі будзе назірацца рост узроўняў вады.**
- Савет ЕЭК адобрыў распрацоўку ініцыіраванай Беларуссю міждзяржпраграмы «Еўразійскі электробус».
- **Больш за 5,2 тыс. пацярпелых ад галалёдных і халадовых траўмаў зарэгістравана ў Беларусі за тры тыдні.**

# ПОСПЕХ У КУБЕ



Сямікласнік Аляксандр ГУСІНЕЦ вучыцца ў шостай сталічнай гімназіі. А яшчэ займаецца ў «Тэхнічнай акадэміі навучэнцаў» пры гарадскім палацы дзяцей і моладзі. Хлопец — пераможца многіх конкурсаў. Мы заспелі яго за працай над новым праектам — інтэлектуальным святлодыёдным кубам. Куб складаецца з 512 рознакаляровых святлодыёдаў, якія трэба акуратна спаяць паміж сабой, — даволі складаная задача, але юны тэхнік запэўніў, што ў яго ўсё атрымаецца. І потым, гэта ж так цікава!

**Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.**

Энергетыка

## У ЧЫМ РЭЗЕРВ ЭНЕРГАЗБЕРАЖЭННЯ?

**Для вырабу тысячы лістоў паперы з зыходнай сыравіны трэба 15 кілаграмаў драўніны і 300—350 літраў вады, а з другаснай — 5-6 кіло макулатуры і 200—250 літраў вады**

**Энергетычныя метады перапрацоўкі неперапрацоўвальных і цяжка перапрацоўвальных палімерных адходаў у РДФ-паліва (у 2025 годзе запланавана выкарыстоўваць да 235 тысяч тон такога паліва), пераход на біяраскладальную ўпакоўку, выкарыстанне аднаўляльных крыніц энергіі (гелеаводанагравальнікі, цеплавыя помпы), здабыча біягазу з цвёрдых камунальных адходаў. Гэтыя і шмат якія іншыя сучасныя падыходы да руплівага выкарыстання як выкапняў, так і адходаў, стымулююць шукаць усё новыя энергаэфектыўныя рашэнні і бачыць рэзервы эканоміі энергіі ў самых розных галінах народнай гаспадаркі. Спецыялісты патлумачылі, чым могуць дапамагчы ў гэтай справе жыллё і адходы, і расказалі, якія рэгіён Беларусі найбольш энергаэфектыўны.**

СТАР. 4

Сумесны праект «Звязды» і Міністэрства па надзвычайных сітуацыях

ЖЫВІЦЕ Ў БЯСПЕЦЫ!

## ТАК АДПАЧЫВАЦЬ, КАБ НЕ БЕДАВАЦЬ

**Аб чым варта пагаварыць з дзецьмі напярэдадні зімовых канікул?**



**Дзеці не могуць дачакацца адпачынку. Не супраць перадыхнуць ад бясконцай праверкі ўрокаў і іх бацькі. Многія ўжо плануюць, чым заняць сваіх нашчадкаў у вольны час, якім зімовым забавам аддаць перавагу. Прапаноў нямала: наперадзе Новы год і Каляды. Аднак у передНавагодняй мітусні варта не ўпусціць самага важнага — падумаць пра бяспеку сваіх дзяцей у канікулярны перыяд.**

СТАР. 3

ISSN 1990 — 763X


ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

У НОВЫ ГОД – СА СТАРЫМ СЯБРАМ!

Ідзе падпіска на I паўгоддзе 2024 года.

Усім, хто падпісаўся на I квартал або I паўгоддзе 2024 года, у падарунак чатыры календары: насценны, рэлігійны, народны і месяцовы.



На кантролі

# «МЫ ПЕРАЛАМАЛІ ПСІХАЛОГІЮ КІРАЎНІКОЎ ГАСПАДАРАК»

## Як выконваецца даручэнне Прэзідэнта навесці парадак у жывёлагадоўлі Гомельшчыны

**Кіраўніком дзяржавы год таму перад вобласцю была пастаўлена задача навесці парадак у жывёлагадоўлі. «Даручэнні былі дадзены генеральнаму пракурору, міністру ўнутраных спраў і адказнаму за Гомельскую вобласць. Увесь гэты час мы маніторылі сітуацыю на малочнатаварных комплексах. Было шмат бязладдзіцы, падзёж жывёлы і інш. Сёння трэцяя нарада падобнага кшталту, дзе мы будзем канстатаваць, што ёсць станоўчыя змены. Мы сёння назіраем зніжэнне падзяжу, а таксама рост пагалоўя БРЖ на 6,1 тысячы галоў», — адзначыў пракурор Гомельскай вобласці Віктар Марозаў на нарадзе па пытаннях АПК у паўднёва-ўсходнім рэгіёне.**

Пракурор Гомельскай вобласці прывёў таксама прыклады з афіцыйнай статыстыкі. Так, з 61 заведзенай крымінальнай справы па прыпісках няма фактаў 2023 года. «Усе прыпіскі — мінулых гадоў. Гэта сведчыць аб тым, што мы пераламалі псіхалогію нашых кіраўнікоў, ёсць разуменне пра тое, што прыпіскі — гэта дзеянні, якія крымінальна караюцца. Думаю, у тым плане будзе менш крымінальных спраў. Дала эфект і прафілактычная работа. Гучныя працэсы, якія праходзілі ў прысутнасці кіраўнікоў гаспадарак, выязныя судовыя пасяджэнні мелі выхаваўчае значэнне», — акцэнтаваў увагу ён.

Разам з тым Віктар Марозаў акрэсліў, што яшчэ шмат працы наперадзе.

Каардынацыйны савет па барацьбе са злачыннасцю і карупцыяй у рэгіёне праходзіў у Гомельскім аблвыканкаме пры ўдзеле намесніка кіраўніка спраў Прэзідэнта Мікалая Рагашчука, старшыні Гомельскага аблвыканкама Івана Крупко, памочніка Прэзідэнта — інспектара па Гомельскай вобласці Юрыя Горлава, генеральнага пракурора Андрэя Шведа.

«Гэта сур'ёзная размова на дастаткова высокім узроўні», — падкрэсліў Віктар Марозаў.

Як адзначыў першы намеснік старшыні аблвыканкама Дзмітрый Петражыцкі, у другім паўгоддзі бягучага года з улікам больш жорсткага кантролю з боку раённых і абласных структур кіравання за выпойваннем і ўтрыманнем удалося знізіць падзёж маладняку на 13 працэнтаў да аналагічнага ўзроўню 2022 года. «Адзін з фактараў — паляпшэнне імунага статусу маладняку. Асабліва ў Веткаўскім, Гомельскім, Добрушскім раёнах. А таксама будаўніцтва 37 прафілакторыяў», — падкрэсліў ён.

Гэта работа будзе прадоўжана і ў 2024 годзе. «У планах будаўніцтва 42 новых і рэканструкцыя 21 існуючага памяшкання, што дасць магчымасць стварыць дадаткова 6,2 тысячы жывёла-месцаў практычна па ўсёй вобласці», — прывёў прыклады Дзмітрый Петражыцкі. Істотна дапамогуць палепшыць сітуацыю нарыхтаваныя ў дастатковай колькасці кармы — 31,32 ц кармавых адзінак на ўмоўную галаву жывёлы, набыццё 120 пастэрызатараў. У рэгіёне абазначана стратэгія развіцця аграпрамысловага комплексу.

Імпартазамяшчэнне

# НА ПАЛІЦАХ — БОЛЬШ СВАЙГО

## Агульную долю беларускіх харчовых і нехарчовых тавараў у крамах у 2024 годзе плануюць павялічыць да 62 працэнтаў

**Пра гэта заявіў журналістам міністр антыманапольнага рэгулявання і гандлю Аляксей БАГДАНАЎ, які ўчора сустракайся з прадстаўнікамі буйных гандлёвых сетак і айчынных вытворцаў, паведамляе БелТА.**



«Сёння ў харчовым блоку доля беларускай прадукцыі займае 78 працэнтаў, а па некаторых групах тавараў даходзіць і да 100 працэнтаў. У прыватнасці, гэта датычыцца мясной, малочнай прадукцыі і яек. У 2024 годзе мы будзем імкнуцца павялічыць долю беларускіх харчовых і нехарчовых тавараў да 62 працэнтаў. У асноўным гэта будзе датычыцца тавараў для прыкасавай зоны і нехарчовых тавараў. Будзем нарошчваць аб'ёмы вытворчасці», — заявіў Аляксей Багданаў.

Паводле яго слоў, самі прадстаўнікі гандлю ўжо гатовы павялічыць долю продажаў беларускіх тавараў.

«Беларускія прадпрыемствы даўно працуюць над тым, каб імпартазамясціць вядомыя заходнія брэнды, і шмат у чым гэта ўжо атрымалася. Сёння, прыходзячы ў крамы, мы бачым гэтыя тавары, але не ў такім шырокім асартыменце, як хацелася б. Таму цяпер прасоўванню імпартазамяшчальнай прадукцыі ўдзяляецца асаблівая ўвага. Упэўнены, што з часам асартымент айчыннай прадукцыі на паліцах беларускіх крам пашырыцца», — рэзюмаваў міністр антыманапольнага рэгулявання і гандлю.

**Старшыня канцэрна «Белдзяржхарчпрам» Алег ЖЫДКОЎ** расказаў, што прадпрыемствы канцэрна за 11 месяцаў выпусцілі больш як 30 тысяч тон імпартазамяшчальнай кандытарскай прадукцыі. «У цэлым за 11 месяцаў прадпрыемствамі канцэрна выпушчана больш за 85 тысяч тон кандытарскіх вырабаў. З гэтага аб'ёму каля 55 тысяч тон пастаўлена на ўнутраны рынак, пры гэтым больш за 30 тысяч тон — гэта імпартазамяшчальны асартымент. Сёння імкнёмся максімальна замясціць імпартныя пазіцыі, а таксама прадставіць нешта сваё — не горш па якасці, але больш даступна па цане», — адзначыў Алег Жыдкоў.

Але пакуль беларускіх цукерак нямат убачыш у самай папулярнай — прыкасавай зоне вялікіх крам. «Мы традыцыйна на працягу шэрагу гадоў займаемся пытаннямі прасоўвання прадукцыі на ўнутраным рынку, і найбольш вострым пытаннем для нас з'яўляецца асваенне прыкасавай зоны. Тут тавары ў асноўным прадстаўлены імпартнымі вытворцамі, але сёлета мы ўжо напрацавалі 142 асартыментныя пазіцыі, якія здольны замясціць імпартныя тавары. «У цэлым можна налічыць больш як адну тысячу найменняў прадукцыі, якую мы гатовы прапанаваць да пастаўкі на ўнутраны рынак. Адзначу, што ў гэту лічбу ўваходзяць распрацаваныя рэцэптуры і тэхналогіі, таму аднамомантна ўвесь гэты пералік не выраблецца», — растлумачыў старшыня канцэрна «Белдзяржхарчпрам».

Паводле яго слоў, гэта прадукцыя выпускаецца выключна па заяўках гандлю. Гэта той асартымент, які на дадзены момант добра прадаецца, карыстаецца попытам і можа добра канкурыраваць. У сувязі з гэтым прадпрыемствам канцэрна «Белдзяржхарчпрам» ставіцца задача па нарошчванні экспарту гэтых вырабаў за межы Беларусі.

«Сёння доля тавараў гэтага асартыменту, якія пастаўляюцца, дасягае 30 працэнтаў ад аб'ёму выпуску. Пры гэтым асноўная мэта — забяспечыць задавальненне ўнутранага рынку. Асабліва ў пераднавагодні перыяд, калі попыт на кандытарскія вырабы ўзрастае ў разы. Так, у гэтым годзе прадпрыемствы «Белдзяржхарчпрама» выпусцяць 2,5 мільёна навагодніх падарункаў у розных фарматах і розных па асартыменце. Гэта адпавядае існуючаму попыту. Выпускацца навагоднія падарункі будуць аж да 31 снежня, таму ўсе магазіны будуць у дастатковым аб'ёме забяспечаны гэтай прадукцыяй», — падкрэсліў Алег Жыдкоў.

Гаворачы аб экспарце, ён паведаміў, што беларускія кандытарскія вырабы пастаўляюцца ў 24 краіны. «У прыватнасці, на мінулым тыдні падпісалі кантракт на пастаўку кандытарскіх вырабаў у В'етнам. Акрамя таго, усё больш пастаўляем прадукцыі на рынак Кітая, бачым тут устойлівую тэндэнцыю да росту. Таксама актыўна працуем і на традыцыйных рынках краін ЕАЭС, Узбекістана і Манголіі. Спрабуем ісці і ў напрамку краін Афрыкі», — падсумаваў кіраўнік канцэрна.

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Колькасць нелегальных перасячэнняў граніц ЕС стала рэкорднай за сем гадоў

Больш за 350 тысяч незаконных перасячэнняў граніц Еўрапейскага саюза выяўлена за першыя 11 месяцаў бягучага года, паведаміла РІА «Новости» са спасылкай на Еўрапейскае пагранічнае агенцтва (Frontex). «У 2023 годзе назіраўся значны рост колькасці незаконных перасячэнняў граніцы, якая павялічылася на 17 працэнтаў за 11 месяцаў. Гэта стала найвышэйшым значэннем, зарэгістраваным з 2016 года», — адзначаецца ў паведамленні агенцтва. Паводле даных Frontex, павелічэнне было ў першую чаргу абумоўлена колькасцю прыбыццяў нелегалаў праз Цэнтральнае Міжземнамор'е, якое застаецца асноўным міграцыйным маршрутам у Еўрасаюзе, на яго прыпадае кожны другі выпадак выяўлення нелегалаў на граніцах ЕС. Тут сёлета за адзінаццаць месяцаў зафіксавана больш за 152 тысячы парушэнняў. Frontex таксама звяртае ўвагу на крайнюю небяспеку нелегальнай міграцыі па моры. Так, сёлета ў Міжземнамор'і знікла больш за 2,5 тысячы чалавек.

### Абвальванне салянай шахты ў Бразіліі пагражае экалагічнай катастрофай

У бразільскім горадзе Масеё адбылося частковае абвальванне закінутай салянай шахты, што пагражае буйной экалагічнай катастрофай. Пра гэта паведаміў тэлеканал Euronews. У выпадку затаплення нераспрацаваных участкаў радовішча велізарная колькасць солі можа трапіць у прыбярэжную зону і грунтавыя воды, што разбурыць мясцовыя экасістэмы. «На шахце 18 адбыўся разрыў у сектары ўздоўж гарадской лагуны», — напісаў мэр Жаао Энрыке Калдас на сваёй старонцы ў сацсетцы. На апублікаваных бразільскімі СМІ кадрах відаць, як у момант прарыву на шахце, размешчанай у асноўным пад лагунай, на паверхні вады бурляць вялікія карычневыя бурбалкі. Кіруючая кампанія Braskem паведаміла, што на шахце былі знойдзены «нетыповы рух». Жыццё горада Масеё з насельніцтвам у адзін мільён чалавек было парушана ў 2019 годзе, калі жыхары раёна былі вымушаны пачаць эвакуацыю пасля таго, як на вуліцах і ў будынках пачалі з'яўляцца расколіны. Раён з 14 тысяч будынкаў ператвараецца ў гарадскую здань. Улады горада папярэджваюць, што ў выпадку абвальвання Масеё пагражае «самая вялікая гарадская трагедыя ў свеце».

### Іерогліф «падатак» стаў сімвалам адыходзячага года ў Японіі

Іерогліф «дзэй» («падатак») выбраны сімвалам адыходзячага 2023 года ў Японіі. Урачыстая цырымонія з гэтай нагоды прайшла ў будыйскім «Храме чыстай вады» ў Кіёта, паведаміла ТАСС. Па традыцыі сімвал года напісаў на лісце рысавай паперы памерам 130 на 150 сантыметраў настаяцель храма, манах Сэйхан Моры. Для напісання іерогліфа выкарыстоўваецца пэндзаль дыяметрам 4,5 сантыметра, зроблены ў прэфектуры Хірасіма, выключна з хваста белага каня, і туш, якая спецыяльна прывезена з прэфектуры Нара. Вызначэнне сімвала года праводзіцца з 1995 года. Цяперашняя цырымонія стала 29-й па ліку. Другое месца па папулярнасці заняў іерогліф «гарачы» з-за сёлетняй анамальнай спякоты. На трэцім месцы аказаўся іерогліф «бітва, вайна», які быў выбраны іерогліфам года летась.

**Члены Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь і работнікі Сакратарыята выказваюць глыбокія спачуванні Папкову Аляксандру Андрэевічу, члену Прэзідыума Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь шостага склікання, у сувязі з напаткаўшым яго вялікім горам — смерцю ЖОНКІ.**

**Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь выказваюць глыбокія спачуванні дэпутату Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь чацвёртага і пятага скліканняў Аляксандру Андрэевічу Папкову ў сувязі з напаткаўшым яго вялікім горам — смерцю ЖОНКІ.**

**Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь выказвае глыбокія спачуванні члену Прэзідыума Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь шостага склікання, дэпутату Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь чацвёртага і пятага скліканняў Аляксандру Андрэевічу Папкову ў сувязі з напаткаўшым яго вялікім горам — смерцю ЖОНКІ.**

**Калектыў Выдавецкага дома «Звязда» выказвае глыбокія спачуванні члену Прэзідыума Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь шостага склікання, дэпутату Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь чацвёртага і пятага скліканняў Аляксандру Андрэевічу Папкову ў сувязі з напаткаўшым яго вялікім горам — смерцю ЖОНКІ.**

# ТАК АДПАЧЫВАЦЬ, КАБ НЕ БЕДАВАЦЬ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Як паказвае статыстыка, часцей за ўсё надзвычайныя сітуацыі, галоўнымі «героямі» якіх становяцца непаўналетнія, здараюцца з імі, калі тыя застаюцца адны. Таму першае, аб чым дарослыя павінны паклапаціцца напярэдадні канікул: падумаць аб тым, з кім застануцца дзеці, пакуль вы будзеце адсутнічаць дома. Другі момант, на якім неабходна засяродзіць увагу: прагаварыце з імі магчымыя небяспечныя сітуацыі і спосабы выхаду з іх.

## АГОНЬ «БАЙЦА» ПАЖАРНЫХ АПАВЯШЧАЛЬНІКАЎ

Патлумачце сваім юным дамачадцам, што з агнём не гуляюць і не жартуюць. Прыбярыце з даступных месцаў запалкі, іншыя гаручыя прадметы. Кантралюйце, калі вашы непаўналетнія памочнікі вырашаць прадэманстраваць свае кулінарныя здольнасці. Не можаце быць побач — увогуле не падпускайце малых да пліты. І, самае галоўнае, забяспечце спраўнасць пячнога ацяплення, калі вы жывяце ў прыватным доме. Устанавіце аўтаномныя пажарныя апавяшчальнікі — гэта актуальна як для індывідуальнага дзяжаўладання, так і для кватэры ў шматпавярховіку. Колькі жыццяў выратавалі гэтыя невялікія і малапрыметныя прылады! А колькі б яшчэ маглі...

22 лістапада на пажары ў Ляхавіцкім раёне загінулі двое малалетніх дзяцей. На момант трагедыі ў хаце чатырохгадовы хлопчык і сямігадовая дзяўчынка знаходзіліся адны. Маці ў гэты час была на працы. Аб узгаранні ратавальнікам паведамілі суседзі. Супрацоўнікі МНС, якія аператыўна прыбылі да месца выкліку, засталі жылы драўляны дом цалкам ахопленым агнём. Яго маленькія жыхары ўжо знаходзіліся без прыкмет жыцця.

Ратавальнікі не перастаюць паўтараць: ні пры якіх абставінах не пакідайце малалетніх дзяцей без нагляду! З самага ранняга ўзросту прывівайце ім правілы бяспечных паводзін, навучыце дзеянням пры пажары і абавязкова вывучыце з дзецьмі тэлефонныя нумары службы ратавання 101 і 112.

## ЛЁД — НЕ КАТОК!

Забараніце сваім дзецям выходзіць на лёд на вадаёмах. І няважна, трывалы ён ці не. Праверыць гэта часам складана нават вопытнаму рыбаку, асабліва ўлічыўшы той фактар, што ў розных месцах вадаёма таўшчыня лёду можа адрознівацца.

Вядома, і менавіта так часцей за ўсё бывае, дзеці не заўсёды кажуць, куды ідуць. Аднак, калі задацца мэтай, праверыць гэта нескладана. Калі ж вы давяраеце сваім дзецям і лічыце іх дарослымі, каб адпускаць гуляць адных, то ў абавязковым парадку правядзіце прафілактычную гутарку. Патлумачце ім, чым пагражае выхад на лёд, прывядзіце канкрэтныя прыклады.

На жаль, іх нямала. У пачатку лютага ў Жабінкаўскім раёне пад лёд праваліліся два браты — шасці і васьмі гадоў. У дзень трагедыі хлопцы гулялі на вуліцы. Калі ўвечары дзеці не вярнуліся дахаты, іх бабуля паведаміла аб гэтым у органы ўнутраных спраў. Дзяцей знайшлі ў штучным вадаёме, размешчаным на суседнім участку. Па версіі следства, хлопцы хацелі праверыць трываласць лёду. У выніку дзеці не змаглі самастойна выбрацца з вады і патанулі.



Нават калі вы на сто працэнтаў упэўнены, што ваша дзіця нават блізка не падыдзе да замерзлага вадаёма, раскажыце яму, як дзейнічаць у выпадку, калі лёд трэснуў. У такой сітуацыі вельмі важна не панікаваць. Трэба павольна і акуратна вяртацца ў той бок, з якога прыйшлі. Забараняецца бегчы па лёдзе: такія паводзіны могуць толькі спраакаваць хуткі раскол паверхні, і правальванне пад лёд пазбегнуць не ўдасца. Калі гэта ўсё-такі здарылася, клічце на дапамогу — ёсць шанц, што вас пачуюць. Паспрабуйце трымацца на плаву. Перасоўвайцеся да таго краю палонкі, адкуль ідзе цячэнне. Дабраўшыся да краю, паспрабуйце налегчы грудзьмі на край лёду і, закінуўшы нагу, выбірайцеся на лёд. Не пакідайце спроб выбрацца, нават калі лёд ламаецца. Пасля таго як асноўная частка тулава апынецца на лёдзе, адкаціцеся далей ад палонкі. Павольна і асцярожна паўзіце да бяспечнага месца, адштурхваючыся рукамі і нагамі.

Дзецям, якія ўбачылі, што хтосьці праваліўся пад лёд, не варта геройстваваць і ісці ратаваць свайго таварыша. У першую чаргу ў такой сітуацыі трэба патэлефанаваць ратавальнікам і паклікаць на дапамогу дарослых.

## ЯК ВЫБРАЦЬ І ЭКСПЛУАТАВАЦЬ ГІРЛЯНДУ?

З улікам падрыхтоўкі жылля да Новага года і Каляд паклапаціцеся стварыць прастору не толькі прыгожую, а яшчэ і бяспечную. Многія думаюць, што электрагірлянда — прыбор, які можна эксплуатаваць без нагляду, днём і ноччу пакідаючы ў сетцы. Модныя цяпер гірлянды-шторы ёсць фактычна ў кожнай сям'і: імі ўпрыгожваюць вокны, сцены, дзверы, ствараюць фотазоны. Па традыцыі размяшчаюць электрагірлянды і на штучных навагодніх дрэвах. Нярэдка ялінкі з «агеньчыкамі» ўстанаўліваюць у дзіцячых пакоях.

— Гірлянда — гэта электраприбор, таму, купляючы яе, патрабуйце ў прадаўца сертыфікат адпаведнасці, уважліва вывучайце інструкцыю, — звяртае ўвагу **афіцыйны прадстаўнік Мінскага абласнога ўпраўлення Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Анастасія ШВАЙБОВІЧ.** — Важна, каб якасць і бяспека прыбора былі пацверджаны. Перад першай эксплуатацыяй праверце работу ўсіх рэжымаў гірлянды, надзейнасць гнёздаў, ізаляцыю праводаў, злучэнне з блокам кіравання. Калі гірлянда, якая ўжо была ў вас у выкарыстанні, выклікае сумненні — няма лямпачкі, ёсць пашкоджанні, агаленыя правады, самаробныя злучэнні, — выкарыстоўваць яе нельга. І ніколі не пакідайце гірлянды ўключанымі ў сетку без нагляду, тым больш — на ноч.

Адны выкарыстоўваюць гірлянды для ўпрыгожвання памяшканняў усярэдзіне, іншыя — звонку (на вуліцы). Аднак не многія ведаюць, што калі замест вулічнай гірлянды выкарыстоўваць «хатнюю» (больш танны варыянт), без спецыяльнай абароны ад траплення вільгаці гірлянда не толькі выйдзе са строю, але і можа стаць прычынай узгарання.

## ПЕТАРДЫ І ФЕЕРВЕРКІ — «ЦАЦКІ» ДЛЯ ДАРОСЛЫХ

Петарды і іншая піратэхніка ў руках дзяцей, падлеткаў, а часам і дарослых можа прывесці да трагічных наступстваў. Можна атрымаць траўмы і апёкі. Петарда рызыкуе выклікаць пажар: калі кінуць яе каля будынка, яна здольная заляцець на балкон шматпавярховіка. Ад запуску піратэхнікі могуць пацярпець іншыя людзі і гадаванцы. Асабліва небяспечна высвятляць, чаму прылада не спрацавала.

Выконвайце правілы бяспекі самі і пагаварыце з дзецьмі, растлумачце ім, да якіх наступстваў могуць прывесці гульні з петардамі і іншай піратэхнікай. Днямі ад петарды пацярпеў дзесяцікласнік. Няшчасны выпадак здарыўся ў Бабруйску. Як высветлілася, небяспечная «цацка» ўзарвалася ў школьніка ў руцэ. Хлопец атрымаў траўмы. Падобная сітуацыя ў панядзелак адбылася ў Лепельскім раёне. Хлопчык заўважыў на дарозе петарду і падняў яе. Праз некаторы час школьнік падпаліў яе — піратэхніка спрацавала ў руцэ. З апёкамі яго даставілі ў бальніцу.

— Піратэхнічныя вырабы варта набываць толькі ў спецыялізаваных аддзелах крам ці спецыялізаваных крамах, — папярэджвае Анастасія Швайбовіч. — Ні ў якім разе не купляйце піратэхніку на рынках, дзе не выконваюцца ўмовы захоўвання. З-за невыканання тэмпературных рэжымаў, вільготнасці набытая піратэхніка можа не спрацаваць ці спрацаваць у руках. Вырабы павінны мець сертыфікаты адпаведнасці, а таксама падрабязныя інструкцыі па выкарыстанні. Не эканомце на бяспецы! Звярніце ўвагу на тэрмін прыдатнасці (як правіла, піратэхніка захоўваецца не больш за тры гады) і інструкцыю (абавязкова на беларускай або рускай мове). Разгледзьце пакунак і сам выраб: дэфектаў быць не павінна.

Захоўваць піратэхніку варта ў сухім памяшканні, дзе няма доступу да агню. Напрыклад, балкон ці кухня ў якасці склада не падыходзяць: выраб альбо адсырэе і ў лепшым выпадку не спрацуе, а ў горшым — стрэліць у самы нечаканы момант. Або наадварот: паступова награваючыся, спрацуе адвольна. Перш чым запускаць, абавязкова прачытайце інструкцыю яшчэ раз: у кожнага вырабу — свае асаблівасці.

Плануючы загадзя феерверк, неабходна падумаць аб пляцоўцы для яго запуску. Пры гэтым неабходна мець на ўвазе, што пляцоўка, якую вы абралі для сябе днём, вечарам можа быць занятая, напрыклад, машынамі. Прыводзіць піратэхніку ў дзеянне маюць права толькі дарослыя. Сачыце, каб дзеці знаходзіліся ў бяспечнай зоне. І тады сустрэнеце Новы год не толькі ярка, але яшчэ і бяспечна.

**Вераніка КАНЮТА.**

**Фота з адкрытых крыніц.**

### КАЛІ ПІРАТЭХНІКА НЕ СПРАЦАВАЛА, НЕАБХОДНА ПРЫТРЫМЛІВАЦЦА НАСТУПНЫХ ПРАВІЛАЎ:

1. Упэўніцеся ў тым, што феерверк не пачне страляць, пачакаўшы 10-15 хвілін на бяспечнай адлегласці. Калі праз гэты час нічога не спрацавала, то можна падысці да феерверка.
2. Падышоўшы да феерверка, неабходна яго візуальна агледзець, каб пераканацца ў адсутнасці частак, якія тлеюць. Калі такога няма, можна прыступаць да далейшых дзеянняў. У выпадку выяўлення частак, якія тлеюць, адыдзіце на бяспечную адлегласць. Такі выраб усё яшчэ ўяўляе пагрозу і можа нанесці значную шкоду вашаму здароўю.
3. Ні ў якім разе нельга нахіляцца над феерверкам, які не спрацаваў. Гэта таксама можа скончыцца сумна!
4. Салют, які не спрацаваў, неабходна пакласці ў ваду на некалькі гадзін.
5. Феерверк неабходна выкінуць разам з бытавым або будаўнічым смеццем. З харчовымі адходамі неспрацаваны выраб утылізаваць нельга.
6. Катэгарычна забаронена кідаць у вогнішча такія вырабы. Наступствы могуць быць непрадказальнымі!

У выпадку пажару і іншай надзвычайнай сітуацыі тэлефануйце ратавальнікам па тэлефоне 101 ці 112!

Беражыце сябе!

# ДАРОГА ПАТРАБУЕ СТРЫМАНАГА СТЫЛЮ

**Умовы надвор'я, калі плюсавая тэмпература ў дзённы час штодня змяняецца начнымі замаразкамі, дыктуюць стрыманы стыль кіравання. Вадзіцелі вымушаны рухацца пры галалёдзіцы, тумане, дажджы, які пераходзіць у мокры снег, што, безумоўна, ускладняе дарожную сітуацыю, паведамілі ў МУС.**

«Па-першае, гэты рух ва ўмовах абмежаванай бачнасці, па-другое, слізкае пакрыццё. У некаторых выпадках узрастае тармазны шлях, павялічваецца небяспека заносаў, рызыка наездаў на пешаходаў», — растлумачылі складанасць дарожнай абстаноўкі ў ведамстве.

Дарэчы, менавіта занос стаў прычынай смяротнага ДТЗ у Дзяржынскім раёне. Там у раніших прыцемках на ўчастку аўтадарогі М1 Брэст — Мінск — граніца РФ, паблізу вёскі Забалацце аўтацягнік, абганяючы спадарожную машыну, выехаў на раздзяляльную паласу і наехаў на гурбу. Аўтацягнік з прычэпам занесла на паласу сустрэчнага руху, дзе ён сутыкнуўся з грузавіком МАЗ. У выніку вадзіцель МАЗа аказаўся заціснутым у кабіне, яго дэблакавалі ратавальнікі і даставілі ў бальніцу, але назаўтра 45-гадовы мужчына ад атрыманых траўмаў памёр.

У такіх умовах надвор'я аўтамабілістам трэба выбіраць найбольш бяспечную хуткасць руху і дыстанцыю, адмовіцца ад рэзкіх манеўраў, якія могуць прывесці да стварэння аварыйных сітуацый, нагадалі ў МУС. Вадзіцелі абавязкова павінны прышпільвацца рамянямі бяспекі, перад паездкай ачысціць аўтамабіль ад снегу і лёду, запоўніць бачок абмывальніка незамярзальнай вадкасцю.

Пешаходам важна абазначаць сябе святлоадбівальнымі элементамі і быць вельмі ўважлівымі пры перасячэнні праезнай часткі.

Дзяржаўтаінспекцыя забяспечвае кругласутачны маніторынг дарожнай абстаноўкі для своечасовай арганізацыі работ па ўстараненні фактараў надвор'я, дадалі ў Міністэрстве ўнутраных спраў.



Фота Ірыны СІДАРОК.

# У ЧЫМ РЭЗЕРВ ЭНЕРГАЗБЕРАЖЭННЯ?

## ЖЫЛЛЁ — ВАЖКІ ЭНЕРГАСПАЖЫВЕЦ

У краіне больш як 1,5 мільёна жылых дамоў плошчай 267 млн $м^2$. 64 % жылфонду — шматкватэрныя дамы, якія з'яўляюцца вельмі ёмістым спажыўцом камунальных рэсурсаў і істотным рэзервам для зніжэння затрат і павышэння энергаэфектыўнасці. Найперш гэта зніжэнне цеплastrат у жылых будынках. Пра дасягненні жыллёва-камунальнай гаспадаркі ў энергакірунку расказаў **Вадзім КІЦІКАЎ, дырэктар Інстытута жыллёва-камунальнай гаспадаркі:**



— Амаль палову жылфонду ў Беларусі можна аднесці да энергаэфектыўнага, што, несумненна, дасягненне. Каля 10 % будынкаў спажываюць энергію на ўзроўні 90 кВт·г і менш на $м^2$ у год. Прыкладна 40 % жылля патрабуе для функцыянавання менш за 120 кВт·г на $м^2$ у год. Вызначальныя фактары для павышэння энергаэфектыўнасці жылля — змяншэнне долі спажывання энергіі на ацяпленне і гарачае водазабеспячэнне з улікам зніжэння страт, а таксама змяншэнне удзельных затрат на выраб і падачу цеплаэнергіі.

Дырэктар інстытута ЖКГ адзначыў, што, каб жыллё стала максімальна энергаэфектыўным, трэба імкнуцца да наступнага.

Набліжаць будынкі да паняцця «дом нулявой энергіі». У такім будынку выкарыстоўваюцца АКЭ, сістэма рэкуперацыі цяпла, забяспечаны максімальны ўзровень цеплавой абароны будынка, а яго энергаспажыванне імкнецца да нуля.

Пашыраць выкарыстанне (па магчымасці) дэцэнтралізаванага цеплазабеспячэння жылога сектара, што дазволіць задзейнічаць электраэнергію і АКЭ для ацяплення і гарачага водазабеспячэння.

Укараняць прылады ўліку спажывання цеплаэнергіі і дыстанцыйнай перадачы даных, а таксама комплексныя рашэнні па цеплавой рэнавацыі будынкаў.

Выкарыстоўваць адзіныя падыходы ў пытаннях энергаэфектыўнасці на ўсіх этапах жыцця дома: ад праектавання і будаўніцтва да ўкаранення ў будынках праграмна-тэхнічных комплексаў і эксплуатацыі дома.

Ёсць рэзерв і ў водаправодна-каналізацыйнай гаспадарцы, дзе трэба прымяняць інавацыйныя тэхналогіі і абсталяванне, дадаў вучоны:

— Найперш, гэта зніжэнне спажывання электраэнергіі падчас тэхналагічных працэсаў пад'ёму вады (а затраты электраэнергіі — гэта да 20 % ад іх агульнай колькасці). Існуюць добрыя айчынныя практыкі па зніжэнні гэтага складніка, напрыклад, выкарыстанне электрарухавікоў з сінхронным прывадам. Такія энергаэфектыўныя тэхналогіі ўкараняе і экспартуе, напрыклад, прадпрыемства «Завод Прамбурвод». Павышэнне энергаэфектыўнасці (ад 5 да 15 %) — і ва ўкараненні дыспетчарызацыі інфармацыйных кіруючых працэсаў.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

## МАКУЛАТУРА, ШКЛАБОЙ І ПАЛІМЕРЫ ДЛЯ РУПЛІВАСЦІ

Вялікія рэзервы маюцца таксама ў цвёрдых камунальных адходах (ЦКА) і другасных матэрыяльных рэсурсах (ДМР). Гэтая сфера рэгулюецца на дзяржузроўні і замацавана ў нацыянальных праграмных дакументах, у прыватнасці праграме «Камфортнае жыллё і спрыяльнае асяроддзе», падкрэсліў Вадзім Кіцікаў:

— Тут вялікія рэзервы для зніжэння затрат у цэлым. Макулатура, напрыклад, — адзін з самых выгадных для перапрацоўкі відаў ДМР. Для вырабу тысячы лістоў паперы з зыходнай сыравіны трэба 15 кілаграм драўніны і 300—350 літраў вады, а з другаснай — 5-6 кіло макулатуры і 200—250 літраў вады. Зніжэнне затрат відавочнае.

Рэзерв шклабою таксама істотны (калі забяспечыць яго паўнавартасны збор). На кожныя 10 % дабаўленага шклабою спажыванне энергіі змяншаецца на 3 %. А паколькі ў сярэднім кожная бутэлька складаецца прыкладна з 60 % шклабою, то эканомія энергіі складае 20 %. Летась, дарэчы, сабрана і перапрацавана 190 тысяч тон адходаў шкла, дадаў вучоны.

Перапрацоўка палімерных адходаў у РДФ-паліва — яшчэ адзін напрамак энергазберажэння. Як сведчыць статыстыка, на аднаго беларуса прыходзіцца 33 кілаграмы палімерных адходаў. Летась у краіне ўтварылася за год каля 320 тысяч тон палімернага смецця (пяць гадоў таму гэтая лічба была 280 тысяч тон), у якое ўваходзяць палімерныя адходы вытворчасці і смецце ў складзе ЦКА. 106 тысяч тон з іх (прыкладна 38 % ад агульнага аб'ёму ўтварэння) адправіліся летась на перапрацоўку.

— На сусветным узроўні такая лічба перапрацоўкі — сур'ёзны вынік, — падкрэсліў спецыяліст. — У Германіі, напрыклад, перапрацоўваецца 48 % палімерных адходаў, а ў Еўрасаюзе ў цэлым — толькі 25 %. Звыш 108 тысяч тон адходаў у нашай краіне — аб'ёмы складанай і неперапрацоўвальнай палімернай камбінаванай упакоўкі. І ў гэтай сферы паўстаюць задачы па перспектыўных даследаваннях і тэхналогіях, таму што гэтыя пытанні трэба вырашаць цяпер. Найперш гэта датычыцца поліэтыленавых пакетаў, аднаразовых пластыкавых вырабаў і рэчаў са змешаных палімераў.

## БЕРАЖЛІВАСЦЬ У ЦУКРОВАЙ ГАЛІНЕ

Сярод ведамстваў у справе энергаэфектыўнасці найбольш праявілі сябе арганізацыі «Белпаліўгаз» і «Белдзяржхарчпрам», сведчаць спецыялісты галіны. У канцэрне «Белдзяржхарчпрам» штогод распрацоўваюць і рэалізоўваюць мерапрыемствы, скіраваныя на эканомію паліўна-энергетычных рэсурсаў (ПЭР), паколькі зніжэнне энергетычнага складніка сабекошту прадукцыі — адзін з галоўных шляхоў змяншэння сабекошту ў цэлым, заўважыў **Мікалай КУДЗЕЛКА, начальнік упраўлення навукова-тэхнічнага развіцця, капітальнага будаўніцтва і інвестыцый канцэрна «Белдзяржхарчпрам»:**

— На прадпрыемствах канцэрна доля энергетычнага складніка прадукцыі досыць моцна адрозніваецца. На прадпрыемствах цукровай галіны яна, напрыклад, складае 20 %, а на прадпрыемствах алкагольнай галіны — каля 5 %. Аднак у некаторых галінах гэтае значэнне дасягае 28 %. Арганізацыі канцэрна зацікаўлены ў прасоўванні сваёй прадукцыі не толькі на ўнутраныя, але і на знешнія харчовыя рынкі, таму прадукт мусіць быць канкурэнтаздольны. Гэтаму садзейнічае не толькі якасць прадукцыі, якая выпрабляецца з натуральнай сыравіны, але і афармленне, выкарыстоўванне новых відаў дызайну ўпаковак, а таксама мерапрыемствы, скіраваныя на зніжэнне сабекошту прадукцыі, у тым ліку на эканомію ПЭР.

Доля цукровай галіны ў агульным спажыванні энергарэсурсаў канцэрна дасягае 46-47 %, таму мерапрыемствы па энергазберажэнні ў гэтым сегменце займаюць ільвіную долю. Сярод прыманых мер — мерапрыемствы, звязаныя з аптымізацыяй цеплазабеспячэння, павелічэннем паверхняў нагрэву, заменай жалюзійных прылад, павышэннем энергаэфектыўнасці дзеючых тэхналогій вапнава-абпальвальнай установкі, мадэрнізацыяй схем нагрэву соку перад сатурацыяй на цукровых камбінатах, рэканструкцыяй тэхналагічных схем з установкай ёмістасцяў для захоўвання сіропу, прывёў прыклад Мікалай Кудзелка:

— У рамках інвестыцыйнай дзейнасці праведзена мадэрнізацыя і рэканструкцыя вытворчасці цукровых камбінатаў. Істотна павялічыліся вытворчыя магутнасці. Разам з тым на прадпрыемствах рэалізоўваюцца мерапрыемствы з прымяненнем адходаў. Мадэрнізавана, напрыклад, кацельная аднаго з прадпрыемстваў, дзе ўстаноўлены цвёрдапаліўныя кацёл, сыравінай для якога служаць адходы вытворчасці.

## МЯСЦОВАЕ ПАЛІВА НА СЛУЖБЕ Ў ТАРФЯНІКАЎ І КАМУНАЛЬНІКАЎ

Летась аб'яднанне «Белпаліўгаз» сэканоміла паліўна-энергетычных рэсурсаў у аб'ёме 3,7 тысячы т.у.п. (па плане — 3 тысячы) і выканала паказчык па энергазберажэнні ў памеры -2,8 % пры заданні -2,4 %. Сёлета па выніках года плануецца сэканоміць не менш за 3,5 тысячы т.у.п. пры заданні 3000 т.у.п., а эканамічны эфект ад рэалізацыі энергазберагальных мерапрыемстваў ацэньваецца ў 2,3 мільёна рублёў.

За 2022-і спецыялістамі прадпрыемства выканана 65 мерапрыемстваў, скіраваных на энергазберажэнне, расказаў **Аляксандр БЕЛКІН, начальнік упраўлення па фарміраванні навуковай палітыкі ў галіне газазабеспячэння і забеспячэння агульных відаў дзейнасці аб'яднання «Белпаліўгаз»:**

— Аб'яднанне «Белпаліўгаз» вядзе мэтанакіраваную работу па эфектыўным і рацыянальным выкарыстанні ПЭР (у тым ліку мясцовых ПЭР) і нетрадыцыйных і аднаўляльных крыніц энергіі; укараняе ў вытворчасць сучасныя энергаэфектыўныя тэхналогіі; павышае энергаэфектыўнасць існуючых вытворчасцяў, абсталявання і матэрыялаў; праводзіць энергетычныя аўдыты; займаецца праектамі па альтэрнатыўнай энергетыцы і выкарыстанні электраэнергіі.

Сярод энергазберагальных мерапрыемстваў 2022—2023 гг. ён адзначыў увод у эксплуатацыю новай цеплакрыніцы з высокаэфектыўнымі катламі вытворчага цэха «Слуцкі» ў таварыстве «Старобінскі торфабрыкетны завод» (Старобінскі ТБЗ), замену паравога катла на газападобным паліве цвёрдапаліўным катлом у таварыстве «Торфабрыкетны завод Лідскі», распрацоўку праектна-каштарыснай дакументацыі па аб'ектах будаўніцтва мадэрнізаванай кацельнай торфапрадпрыемства «Дняпроўскае», мадэрнізацыю катлавой установкі з катлом ДКВР 20-13 у кацельнай Старобінскага ТБЗ.

Работа па энергазберажэнні працягнецца і ў 2024—2025 гг. У планах — сэканоміць за кошт адпаведных мерапрыемстваў не менш як 5,5 тысячы т.у.п. і дасягнуць долі мясцовых ТЭР у балансе кацельна-пячнога паліва не менш за 71,5 %, падзяліўся планамі прадстаўнік «Белпаліўгаз».

Самым энергаэфектыўным рэгіёнам сёлета прызналі Віцебшчыну. Гэтага звання вобласць не атрымала, калі б не мерапрыемствы ў нафтавым і энергетычным сектарах, у прыватнасці выпрацоўка другасных энергарэсурсаў на ўстаноўцы каксавання нафтавых рэштак таварыства «Нафтан». Гадавы эфект па гэтым мерапрыемстве склаў 112,6 тысячы т.у.п., расказала **Кацярына САВІК, галоўны спецыяліст сектара энергетыкі і паліва камітэта па архітэктуры і будаўніцтве Віцебскага аблвыканкама:**

— Віцебскі аблвыканкам выконвае заданні дзяржпраграмы па долі мясцовых відаў паліва (МВП) і аднаўляльных крыніц энергіі. Высокія паказчыкі дасягнуты найперш за кошт замены катлоў і ўкаранення дадатковых катлоў, якія працуюць на МВП, у сістэму ЖКГ.

У 2016-м доля мясцовага паліва ў сістэме ЖКГ складала 66 %, цяпер яна 74 %, і гэта найвышэйшы паказчык у краіне. А ў раённых арганізацыях ЖКГ, дзе ў папярэднія гады былі ўведзены дадатковыя магутнасці на МВП, іх доля імкнецца да 95—100 %, удакладніла яна.

Адным словам, нягледзячы на ўжо дасягнутае, ёсць яшчэ да чаго імкнуцца.

**Ірына СІДАРОК,**
**фота аўтара.**

# ПАД ЗНАКАМ ПЕРШАДРУКАРА. ГОМЕЛЬСКАЯ ШКОЛА

## Да аднаго юбілею ў ГДУ імя Францыска Скарыны

**Сёлета спаўняецца 35 гадоў з часу надання Гомельскаму дзяржаўнаму ўніверсітэту імя Францыска Скарыны. Гомельшчына займае своеасаблівае месца на літаратурнай і культурнай карце славянскага свету. Ад IX стагоддзя землі радзімічаў з'яўляліся транзітнай тэрыторыяй на шляху «з варагаў у грэкі». Акадэмік Мікіта Талстой называў наш рэгіён «ідэальным палігонам, запаведнікам для даследчыка старажытнаславянскай эпохі». Літаратурная традыцыя ў нашым рэгіёне бярэ пачатак яшчэ ад слаўнага святога Кірылы з Турава.**




### Іван-град беларускай літаратуры

З Гомельшчыны паходзяць чатыры народныя пісьменнікі Беларусі: Іван Мележ, Іван Шамякін, Іван Навуменка, Андрэй Макаёнак. Нездарма наш край называюць Іван-градам беларускай літаратуры. Тут нарадзіліся і працавалі лаўрэаты Дзяржаўнай прэміі Беларусі Іван Шамякін, Віктар Казько, Барыс Сачанка, Анатоль Грачанікаў, Іван Сяркоў, Мікола Мятліцкі, Міхась Башлакоў. Варта таксама назваць імёны ўраджэнцаў Гомельшчыны Сяргея Палуяна, Міхала Грамыкі, Сцяпана Некрашэвіча, Леаніда Гаўрылава, Валянціны Коўтун, Андрэя Федарэнкі, Анатоля Зэкава, Васіля Якавенкі, Аляксандра Капусціна, Уладзіміра Гаўрыловіча, Леаніда Гаўрылкіна, Анатоля Бароўскага, Уладзіміра Ліпскага, Віктара Яраца, Соф'і Шах, Нэлі Тулупавай, Анатоля Сыса, Міхася Ткачова, Таісы Мельчанкі, Ніны Шкляравай, Алеся Наўроцкага і многіх іншых.

На Гомельшчыне нарадзіўся, жыў і пахаваны рускі празаік, літаратурны крытык, публіцыст, мастацтвазнаўца Уладзімір Кігн-Дзедлаў (1856—1908). Дарэчы, у мінулым годзе аспірант кафедры з КНР Дзі Хе Хе пад кіраўніцтвам Івана Штэйнера паспяхова абараніў дысертацыю на атрыманне ступені кандыдата філалагічных навук якраз па творчасці Кігн-Дзедлава. З Гомельшчыны паходзіць Іосіф Гашкевіч, складальнік першага руска-японскага слоўніка.

З Калінкавіцкай зямлі — продкі Яўгенія Еўтушэнкі, з Палессем звязана станаўленне адметнага паэта Ігара Шклярэўскага, з Веткі паходзіць Дзмітрый Кавалёў, у Рэчыцы нарадзіўся выдатны вучоны і пісьменнік Уладзімір Спасовіч, у Гомелі нарадзілася Лідзія Ржэўская. Празаік, паэт, вучоны Міхаіл Расолаў стварыў цэлую эпапею пра жыццё ўсходнеславянскіх народаў.

Гомельшчына — радзіма многіх яўрэйскіх паэтаў: Рыгора Добіна, Зіновія Вагера, Самуіла Галкіна, Навума Дзегцера, Самуіла Ляўчука і інш.

У розныя часы на Гомельшчыне нарадзіліся, жылі ці пісалі пра яе польскамоўныя аўтары Юзаф Будзіла, Уладзіслаў Сыракомля, Эма Дмахоўская, Часлаў Пяткевіч ды іншыя.

Тут нарадзілася цэлая плеяда выдатных вучоных-філолагаў, сярод якіх прафесары Фёдар Куляшоў, Юрый Пшыркоў, Навум Перкін, акадэмік Іван Навуменка, член-карэспандэнт Сцяпан Лаўшук, даследчыкі рускай літаратуры Іосіф Вайнберг, Аляксандр Шыфман.

### Там, дзе бруіць «Крыніца»

Значная работа па вывучэнні жыцця і творчасці нашых славутых землякоў праводзіцца кафедрай беларускай літаратуры ГДУ імя Ф. Скарыны.

Пачатак рэгіянальным даследаванням у нашай навучальнай установе быў закладзены на пачатку 70-х гг. ХХ ст. вядомым беларускім вучоным, заслужаным дзеячам навукі БССР, доктарам філалагічных навук, прафесарам Мікалаем Грынчыкам (1923—1999), чый 100-гадовы юбілей мы адзначаем сёлета. Дарэчы, Грынчык быў першым сярод выкладчыкаў ГДУ, хто абараніў доктарскую дысертацыю.

У час працы загадчыкам кафедры беларускай літаратуры Грынчык арганізаваў студэнцкую навуковую лабараторыю па фальклоры, з'яўляўся адным з аўтараў акадэмічнай «Гісторыі беларускай дакастрычніцкай літаратуры» і падручнікаў для ВНУ. Стварыў і клапатліва падтрымліваў літаратурнае аб'яднанне «Крыніца», блаславіўшы многіх пісьменнікаў у літаратуру. Пад яго кіраўніцтвам рэгулярна праводзіліся канферэнцыі па праблемах рэгіянальнага пачатку ў фальклоры, мове і літаратуры.

Сур'ёзная роля ў станаўленні гомельскай школы літаратуразнаўства належыць Паўлу Ахрыменку, доктару філалагічных навук, які працаваў у Гомельскім педінстытуце (з 1969 года — універсітэце) з 1950 да 1972 года. Ахрыменка — адзін з самых вядомых беларускіх фалькларыстаў, аўтар шматлікіх манаграфій. Сёння фалькларыстычнымі даследаваннямі ў нашым універсітэце плённа займаецца доктар філалагічных навук, прафесар Валянціна Новак. Валянціна Станіславаўна — аўтар звыш 200 публікацый, сярод якіх індывідуальныя і калектыўныя манаграфіі, вучэбныя і практычныя дапаможнікі, артыкулы. Яна з'яўляецца аўтарам-складальнікам шматлікіх фальклорна-этнаграфічных зборнікаў па розных раёнах Гомельшчыны.

У 1991 годзе выкладчыкамі кафедры Валянцінай Смыкоўскай і Верай Генаш быў выдадзены даведнік «Літаратурная Гомельшчына», дзе сабраны звесткі аб васьмідзесяці пісьменніках, што нарадзіліся на Гомельшчыне. У 1976 годзе пабачыла свет манаграфія Валянціны Смыкоўскай «Творчая канцэпцыя пісьменніка: Задума і яе мастацкае ўвасабленне ў «Палескай хроніцы» І. Мележа». Іван Афанасьеў, загадчык кафедры рускай і замежнай літаратур, сваю манаграфію «Будзем садзіць сад» (1991) прысвяціў творчасці нашага земляка, празаіка Віктара Казько, аднаго з самых значных і глыбокіх сучасных пісьменнікаў.

Сёння рэгіянальнымі даследаваннямі плённа кіруе вучань Мікалая Грынчыка Іван Штэйнер, чый 70-гадовы юбілей мы таксама адзначалі сёлета. Інтарэсы Івана Штэйнера як даследчыка надзвычай разнастайныя. У работах вучонага пададзена арыгінальнае асэнсаванне твораў як класікаў нашай літаратуры Янкі Купалы, Якуба Коласа, Васіля Быкава, так і актуальных сучасных аўтараў — Алеся Разанава, Віктара Казько, Раісы Баравіковай, Віктара Шніпа, Анатоля Сыса, Алеся Наварыча, Вінцэся Мудрова і інш.

Шмат увагі ўдзяляе Іван Штэйнер краязнаўчай рабоце. Ён з'яўляўся галоўным каардынатарам міжвузаўскай фундаментальнай тэмы «Палессе-2005». Напісаў і выдаў тры ўнікальныя тамы навукова-папулярных нарысаў («Дняпроўскія матывы: нарысы (пра пісьменнікаў Гомельшчыны, якія нарадзіліся на берагах Дняпра)» (2009); «Прыпяцкая рапсодыя: нарысы (пра пісьменнікаў Гомельшчыны, якія нарадзіліся на берагах Прыпяці)» (2010); «Сожскі карагод: нарысы (пра пісьменнікаў Гомельшчыны, якія нарадзіліся на берагах ракі Сож)» (2010).

Кафедрай беларускай літаратуры сістэматычна праводзіцца Міжнародная навуковая канферэнцыя «Рэгіянальнае, нацыянальнае і агульначалавечае ў літаратуры», удзел у якой прымаюць вядучыя навукоўцы не толькі Беларусі, Расіі, Украіны, Польшчы, але і славісты Германіі, Харватыі, Сербіі, Чарнагорыі, Славеніі.

Сталыя літаратурныя традыцыі мае Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Францыска Скарыны. Загадчык кафедры беларускай літаратуры прафесар Іван Штэйнер у адной са сваіх кніг, прысвечаных творчасці выпускнікоў ГДУ, піша: «З чаго складаецца імідж навучальнай установы, яе ўспрыняцце ў навуковым і культурным свеце, нарэшце, вядомасць і слава? Са старажытных сцен, што перажылі стагоддзі і былі сведкамі векавой эвалюцыі чалавецтва? Са змрочных скляпенняў бібліятэк і кніжных сховішчаў, дзе спачываюць фаліянты ў пергаментна-драўляных вокладках? <...> А можа, славу ўніверсітэта складаюць сівыя (і не вельмі) акадэмікі і прафесары (у мантыях і без іх), пра якіх так любяць апавядаць вясёлыя гісторыі і анекдоты? Але хутчэй за ўсё сапраўдную славу Alma mater прыносяць яе выпускнікі».

### Універсітэт літаратурны і песенны

Гісторыя нашай літаратурнай альма-матар бярэ пачатак яшчэ з 30-х гадоў мінулага стагоддзя. У нашай ВНУ вучыліся Іван Шамякін, Леанід Гаўрылаў, Мікола Сурначоў, Кастусь Кірэенка, Паўлюк Прануза.

Леанід Гаўрылаў, Мікола Сурначоў і Алесь Жаўрук атрымалі дыпломы ў першыя дні Вялікай Айчыннай вайны і загінулі, абараняючы Радзіму.

Гомельскі ўніверсітэт выхаваў лаўрэатаў Дзяржаўнай прэміі Кастуся Кірэенку, Міхася Башлакова, а таксама такіх адметных творцаў, як Віктара Яраца, Анатоля Сыса, Анатоля Зэкава, Вольгу Куртаніч, Анатоля Казлова, Міхаіла Даніленку, Рыгора Андрэяўца, Таісу Мельчанку, Ніну Шкляраву ды інш. У Гомельскім педінстытуце вучыўся Іван Шамякін.

Стала і мэтанакіравана вывучэннем і папулярызацыяй творчасці выпускнікоў ГДУ займаецца загадчык кафедры беларускай літаратуры, прафесар Іван Штэйнер, які мае непасрэднае дачыненне да творчага нараджэння не аднаго паэта. Пад яго рэдакцыяй у 1998 годзе была выдадзена анталогія лірыкі выпускнікоў ГДУ «Крыніцы», «напісаныя аўтарамі ў студэнцкія гады або тэматычна звязаныя з горадам юнацтва, з універсітэтам». Вучоны падаў гісторыю літаб'яднання «Крыніцы», што ўжо некалькі дзесяцігоддзяў працуе пры кафедры.

У 1999 годзе пад рэдакцыяй Штэйнера быў выдадзены зборнік крытычных артыкулаў «Душа прычаліцца крылом да неба...», дзе творчыя партрэты колішніх студэнтаў раскрыты праз прызму бачання студэнтаў канца 90-х гадоў. Напярэдадні 75-гадавога юбілею Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта ў 2003 годзе пад рэдакцыяй Івана Штэйнера і Вольгі Бароўскай падрыхтаваны зборнік «Універсітэт літаратурны. Універсітэт песенны».

А да 80-годдзя Гомельскага ўніверсітэта быў выдадзены зборнік «Alma mater universitatis», новае пераасэнсаванне, твораў выпускнікоў ГДУ, дапоўненае цікавымі ўспамінамі пра гады навучання пачынаючы з успамінаў Івана Шамякіна. Іван Пятровіч з цеплынёй узгадвае колішняга рэктара ГДУ акадэміка Барыса Бокуця: «Шчыры беларус, ён заваражыў мяне веданнем роднай літаратуры... Па ініцыятыве Б. Бокуця мы заключылі няпісаную дамову: у пачатку кожнага навучальнага года ва ўніверсітэце — літаратурны вечар. Сакратар Саюза пісьменнікаў, я падбіраў брыгаду паэтаў, празаікаў, крытыкаў — чалавек 10-12. Праводзіўся агульнаўніверсітэцкі вечар, надзвычайны па сваім змесце, форме, цеплыні, з якой сустракалі нас студэнты, выкладчыкі, кіраўніцтва горада».

Увогуле, кафедра беларускай літаратуры Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Францыска Скарыны добра зарэкамендавала сябе ў славістыцы. Пра гэта сведчаць шматлікія навуковыя публікацыі супрацоўнікаў кафедры, удзел у прэстыжных навуковых форумах, прызнанне калег, трывалыя навуковыя сувязі як з айчыннымі, так і з замежнымі вучонымі.

У 2007 годзе цыкл работ Івана Штэйнера «Беларуская літаратура ў славянскім і сусветным кантэксце» (2002—2007 гг.), які быў прадстаўлены ад ГДУ імя Ф. Скарыны на конкурс Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, быў прызнаны найлепшым даследаваннем у галіне гуманітарных навук, а яго аўтар адзначаны галоўнай навуковай узнагародай краіны — Прэміяй Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Штэйнер — лаўрэат Нацыянальнай літаратурнай прэміі ў галіне літаратуразнаўства.

### Збіраць і вывучаць

Кафедрай беларускай літаратуры праводзіцца вялікая работа па зборы і сістэматызацыі матэрыялаў, звязаных з жыццём і дзейнасцю нашых славутых землякоў, па захаванні ўнікальнай культурнай спадчыны Гомельскага рэгіёна. У 2014 годзе пры кафедры беларускай літаратуры быў арганізаваны літаратурны музей «Alma mater». Экспазіцыя музея ў храналагічным парадку знаёміць з творчасцю пісьменнікаў, музыкаў, якія вучыліся ў галоўнай ВНУ Палесся пачынаючы з 1930-х гадоў і да нашых дзён.

Добра вядомае ў навуковых колах краіны імя Вольгі Шынкарэнкі, колішняга прафесара кафедры. Манаграфія «Пад ветразем дабра і прыгажосці» — адно з самых грунтоўных і комплексных даследаванняў творчасці Караткевіча. У манаграфіі «Нястомных пошукаў дарога» ўпершыню ў беларускім літаратуразнаўстве разглядаюцца праблемы паэтыкі гістарычнага жанру на матэрыяле сучаснай прозы.

Плённа працуе ў напрамку вывучэння жанравай спецыфікі беларускай драматургіі, тэорыі літаратуры Віктар Яцухна, колішні дацэнт кафедры. Ён з'яўляецца аўтарам манаграфіі «Беларуская малафарматная драматургія XVI — першай паловы XX ст.» (Гомель, 2004), вучэбна-метадычных дапаможнікаў «Асноўныя літаратуразнаўчыя метады і школы» Гомель, 2001), «Тэорыя літаратуры» (Гомель, 2002).

Прафесар Анжэла Мельнікава — аўтар манаграфій «Паэтыка твораў Кузьмы Чорнага» (2008), зборніка навуковых артыкулаў «Літаратура і Час: плыні, тэндэнцыі, постаці» (2011), «Канцэптуалізацыя нацыянальнага ў беларускай прозе першай трэці XX стагоддзя» (2016).

Вывучэнне беларускай паэзіі з'яўляецца прадметам навуковых пошукаў дацэнта Алы Брадзіхінай. Брадзіхіна — аўтар манаграфіі «Сучасная беларуская інтымная лірыка: тэндэнцыі і перспектывы развіцця» (Гомель, 2009), зборніка навуковых артыкулаў «90-60-90 (Сучасны літаратурны працэс: на шляху да ідэалу)» (Гомель, 2014).

Спецыфіка жаночай літаратуры — кола навуковых даследаванняў дацэнта Таццяны Фіцнер. Дацэнт кафедры Ірына Бажок падрыхтавала цікавае даследаванне, прысвечанае эвалюцыі жанру эсэ ў беларускай літаратуры.

Сёлета выкладчыкамі кафедры падрыхтавана калектыўная манаграфія «Беларуская літаратура як сацыякультурны феномен: мастацкія дамінанты, жанравы генезіс» (Гомель: ГДУ імя Ф. Скарыны, 2023).

Супрацоўнікі кафедры беларускай літаратуры прымаюць удзел у падрыхтоўцы і распрацоўцы вучэбных і вучэбна-метадычных дапаможнікаў для ўстаноў адукацыі Рэспублікі Беларусь рознага ўзроўню, з'яўляюцца членамі рэдакцыйных калегій навуковых часопісаў, пастаянна прымаюць удзел у выкананні Дзяржаўных праграм фундаментальных даследаванняў.

Як бачым, Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імкнецца годна насіць імя славутага Францыска Скарыны.

**Анжэла МЕЛЬНІКАВА,**
**доктар філалагічных навук, прафесар Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Ф. Скарыны.**

Вядучая рубрыкі Алена КРАВЕЦ.
Тэл. (017) 311-17-36.

# ПА ПУХЛІНЕ — З ЯДЗЕРНАЙ ПУШКІ

## Адзін з самых сучасных метадаў лячэння раку — пратонная тэрапія — даступны для беларусаў дзякуючы сумеснаму з Расіяй праекту

**Унікальную методыку лячэння анкалагічных хвароб — пратонную тэрапію — беларускія пацыенты могуць атрымаць у Федэральным навукова-клінічным цэнтры медыцынскай радыялогіі і анкалогіі Федэральнага медыка-біялагічнага агенцтва Расіі, размешчаным у Дзімітраўградзе Ульянаўскай вобласці. Гэта адзін з метадаў прамянёвай тэрапіі, які ў адрозненне ад шырока распаўсюджанай фатоннай дазваляе накіроўваць пучок прамянёў дакладна на пухліну і разбураць яе, не пашкоджваючы навакольныя здаровыя тканкі. Тое найперш важна пры лячэнні новаўтварэнняў галаўнога мозгу, калі так званыя крытычныя структуры побач не апраменьваюцца.**

**За два гады некалькі дзясяткаў беларусаў, у тым ліку 40 дзяцей, прайшлі пратонную тэрапію ў расійскім цэнтры, і пераважная большасць з іх або выйшла ў стадыю працяглай рэмісіі, або цалкам пазбавілася ад захворвання. Падчас прэс-тура, арганізаванага пры садзейнічанні Пастаяннага камітэта Саюзнай дзяржавы і Міжнароднай медыягрупы «Россия сегодня», журналісты пабывалі ў анкацэнтры ў Дзімітраўградзе, прайшлі шляхам пацыента і паразмаўлялі з беларусам, які праходзіць там лячэнне.**



### Унікальны ў Еўропе

Методыка пратоннай тэрапіі маецца ўсяго ў трох анкацэнтрах Расіі: у Обнінску Калужскай вобласці, Санкт-Пецярбургу і ўласна ў Дзімітраўградзе.

— Наш цэнтр быў створаны па прэзідэнцкім праекце пад патранажам Уладзіміра Пуціна. Мы прайшлі шлях будаўніцтва, падрыхтоўкі, збору ўсіх унікальных тэхналогій і нядаўна адзначалі пяцігоддзе, — расказвае **генеральны дырэктар Федэральнага навукова-клінічнага цэнтра медыцынскай радыялогіі і анкалогіі ФМБА Расіі Юрый УДАЛОЎ.** — Гэта цэнтр замкнёнага цыкла, на пляцоўцы якога прадстаўлены ўсе метады ядзернай медыцыны, якія на сёння даступны не толькі ў Расіі, але і ў Еўропе і свеце. Сам па сабе цэнтр унікальны тым, што аналагаў яму амаль няма — ёсць падобная клініка ў Паўночнай Амерыцы, а на еўрапейскім кантыненце такіх цэнтраў няма.



Канструкцыя гантры.

Тут даступныя ўсе этапы лячэння — ад пастаноўкі дыягназу да рэабілітацыі. У цэнтры аказваецца 12 відаў высокатэхналагічнай дапамогі. Пацыент здае аналізы, праходзіць дыягностыку, у тым ліку УГД, КТ, МРТ, ПЭТ-КТ, і накіроўваецца на той ці іншы від лячэння. Тут жа праводзяцца медыцынскія кансіліумы і далейшае назіранне. У цэнтры пацыент праходзіць і рэабілітацыю першага этапу.

З 2018 года больш за пяць тысяч пацыентаў з 67 рэгіёнаў Расіі атрымалі ў Дзімітраўградзе высокатэхналагічную дапамогу.

— Мы шчыльна працуем і з Міністэрствам аховы здароўя Ульянаўскай вобласці, і з федэральным. Але ўсе дыягнастычныя і клінічныя складнікі не былі б магчымыя без калектыву. За апошнія тры гады мы папоўніліся вялікай колькасцю новых дактароў з вядучых клінік Масквы, Санкт-Пецярбурга, Казані, Арэнбурга. Кожны з іх прыносіць свае навыкі, уменні і новыя кампетэнцыі, — адзначае Юрый Удалоў.

У цэнтры вядуцца навуковыя даследаванні і працуе адукацыйны цэнтр.

— Плюс федэральнай установы ФМБА — гэта сінтэз трох складнікаў: навукі, клінікі і адукацыі. У нашых сценах знаходзіцца адукацыйны цэнтр, адкрыты ў 2021 годзе, дзе мы праводзім навучанне ўласных калег — павышэнне кваліфікацыі, а таксама адкрылі эксклюзіўныя курсы, якія атэставаны на партале НМО. Расказваем аб пратоннай, фатоннай, радыенуклiднай тэрапіі, спалучэнні метадаў, — дзеліцца Юрый Удалоў.

Навуковыя даследаванні праводзяцца ў рамках дзяржзаказу па ўзгадненні з Расійскай акадэміяй навук, а таксама па даручэнні ФМБА.

— Магу з гонарам сказаць, што за апошнія два гады мы імпартазамясцілі два замежныя прэпараты, і на сёння больш за 100 пацыентаў атрымалі лячэнне айчынным радыехларыдам. А сыравіну мы атрымліваем за два кіламетры адсюль, з Навукова-даследчага інстытута атамных рэактараў дзяржкарпарацыі «Расатам». Другі прэпарат — Лютэцый-177. І на сёння першыя 12 пацыентаў завяршылі лячэнне з яго выкарыстаннем з добрым вынікам. У далейшым гэтыя прэпараты будуць укаранёны, — кажа генеральны дырэктар.

### 85 % хворых або вылечваюцца, або дасягаюць рэмісіі

Беларускія пацыенты праходзяць лячэнне ў Дзімітраўградзе ў рамках сумеснага праекта пад патранажам Саюзнай дзяржавы.

— Ён быў ініцыіраваны Веранікай Скварцовай, на той час міністрам аховы здароўя. Цяпер, як кіраўнік ФМБА Расіі, яна актыўна ўдзяляе ўвагу яго развіццю, бо на тэрыторыі Беларусі методыка пратоннай тэрапіі не прадстаўлена. Мы падставілі плячо і актыўна працуем з нашымі калегамі з галоўнай анкалагічнай установы ў Беларусі, — дзеліцца Юрый Удалоў.

Расійска-беларускаму праекту два гады, і ў наступным годзе ён будзе працягнуты.

— Мы пачыналі з 52 пацыентаў і з Расіі, і з Беларусі. Ёсць пэўныя назалагічныя формы, якія і ў Расіі не трапляюць пад квоты, што нам выдаткоўваюць. Цяпер, дзякуючы праекту, пацыенты і з дабраякаснымі новаўтварэннямі, напрыклад, галаўнога мозгу, якія праходзяць па сцэнарыі злаякасных, могуць атрымаць лячэнне метадам пратоннай тэрапіі. Гэта вялікі плюс для расіян, — падкрэслівае генеральны дырэктар.

А для беларусаў значнасць праекта найперш у тым, што лячэнне змагі атрымаць маленькія пацыенты. На сёння такіх амаль 40. Іх сустракаюць і суправаджаюць ад самога аэрапорта. У цэнтры дзяцей размяшчаюць разам з бацькамі.

Штогод колькасць пацыентаў, якія праходзяць лячэнне, павялічваецца. Калі летась іх было 52, то сёлета — 64, а ў наступным годзе тут чакаюць 76 хворых.

— Кіраўнікі нашых дзяржаў паставілі задачу выйсці на лічбу 100, таму і далей мы будзем развіваць гэты праект, — упэўнены Юрый Удалоў. — Ён мае добрую выніковасць дзякуючы і адбору пацыентаў, і своечасоваму іх накіраванню. На сёння 85 % пацыентаў, якія прайшлі лячэнне ў рамках праекта Саюзнай дзяржавы, або дасягнулі рэмісіі, або цалкам вылечаны ад захворвання.

Аднак пратонная тэрапія — толькі частка праекта. Сумесна з Міністэрствам аховы здароўя Беларусі спецыялісты цэнтра ажыццяўляюць дыстанцыйнае кансультаванне, падчас якога дапамагаюць вызначыцца з аптымальнымі метадамі дыягностыкі, лячэння і новых падыходаў.

— Вынікі саюзнага праекта ўваходзяць у пратарэгістр — праграму электроннага ўліку ўсіх вынікаў лячэння, якое прайшлі пацыенты метадам пратоннай тэрапіі. На падставе гэтага па 25 параметрах мы вызначаем аптымальную тактыку будучага лячэння з найменшай колькасцю пабочных эфектаў. І на сёння гэта добры інструмент, які можа выкарыстоўвацца ў далейшым пры тыражаванні і развіцці такіх цэнтраў. У цэлым ёсць вялікія чаканні, што ўсе тыя станоўчыя пачынанні, якія ёсць у сферы анкалогіі ў Расіі, будуць выкарыстоўвацца, у тым ліку нашымі калегамі з Беларусі, — рэзюмуе Юрый Удалоў.

### Лячэнне, якое не выклікае дыскамфорту

Адзін з беларусаў, хто знаходзіцца цяпер на лячэнні ў Дзімітраўградзе, — 34-гадовы лідчанін Дзяніс Курыла.

— Пухліну галаўнога мозгу ў мяне выявілі даўно, у 2016 годзе я быў прааперыраваны. Паўторная аперацыя, татальнае выдаленне пухліны, выканана ў 2017-м, што дазволіла мне жыць далей. У гэтым годзе здарыўся рэцыдыў, ізноў праведзена хірургічнае лячэнне ў Беларусі. Кансіліум прыняў рашэнне накіраваць мяне на далейшую тэрапію ў Расію, — расказвае мужчына. — Са мной звязаліся прадстаўнікі цэнтра, расказалі, як дабрацца, што з сабой узяць. Ляцець у іншую краіну, дзе ў цябе няма знаёмых і блізкіх, крыху хвалюючa. Але мяне сустрэлі ў аэрапорце. У цэнтры мяне поўнасцю абследавалі, прызначылі лячэнне.

Дзяніс павінен прайсці 27 працэдур пратоннай тэрапіі.

— Працэдура не выклікае дыскамфорту, доўжыцца 10 хвілін, якіх-небудзь пабочных эфектаў я не адчуваю. Знаходжанне ў цэнтры камфортнае, спецыялісты вельмі ўважлівыя. Урачы з Беларусі таксама цікавяцца маім самаадчуваннем. Усе пытанні, якія ўзнікаюць дадаткова, хутка вырашаюцца. У мяне была праблема са швом — даставілі ў хірургічнае аддзяленне, агледзелі і апрацавалі.

Рабіць прагнозы пакуль рана, але беларус настроены пазітыўна:

— Хочацца пераадолець сваю хваробу, і калі ёсць магчымасць паспрабаваць прагрэсіўныя метады лячэння, то чаму б і не, — дзеліцца ён.

### «Калі падоўжылі жыццё хоць бы на тры месяцы, значыць, стараліся недарма»

Пра перавагі пратоннай тэрапіі расказаў **кіраўнік пратоннага і фатоннага цэнтра, урач-радыётэрапеўт Сяргей ГРЫЦЭНКА:**

— Існуе ўсяго тры метады лячэння — хірургія, хіміятэрапія, прамянёвая тэрапія. Традыцыйным з'яўляецца метад фатоннай тэрапіі, пры якім выкарыстоўваюцца электрамагнітныя кванты, па сутнасці, гэта энергія 1,6 МэВ, якая выклікае пашкоджанне пухлінных клетак. Мінус заключаецца ў тым, што кванты вельмі лёгкія, і для таго, каб апраменьваць пухліну, даводзіцца ствараць такія ўмовы, пры якіх немагчыма пазбегнуць апраменьвання навакольных тканак. Пры пратоннай тэрапіі выкарыстоўваецца энергія цяжкіх часціц. Якія гэта дае перавагі? Па-першае, мы дакладна ведаем, дзе пратонны пучок спыніцца. Перад тым як спыніцца, ён запавольваецца і тым самым перадае максімальную энергію ў той зоне, дзе спыняецца. Другая вельмі вялікая перавага: за месцам прыпынку пратоннага пучка, так званым пікам Брэга, ідзе рэзкі спад дозы. Гэта значыць, калі мы размяркоўваем пэўную зону, дзе гэты пучок пратонаў спыняецца, мы разумеем, што за межамі яго прыпынку за кошт рэзкага перападу дозы ў нас не будзе апраменьвання, што вельмі важна, асабліва ў тых выпадках, калі мішэнь знаходзіцца ў чэрапе, прычым у аснове, дзе побач размешчана вялікая колькасць крытычных структур. У гэтым выпадку метад пратоннай тэрапіі не мае альтэрнатывы.

Пацыент, які накіраваны на пратонную тэрапію, найперш трапляе ў памяшканне з адмысловым камп'ютарным тамографам для планавання лячэння. Тут праводзіцца перадпрамянёвая падрыхтоўка, выпрабляецца індывідуальная маска, у якой праводзіцца камп'ютарная тамаграфія. Масіў атрыманых здымкаў адпраўляецца ў службу медыка-фізічнага суправаджэння радыетэрапіі.



Сяргей ГРЫЦЭНКА дэманструе індывідуальную маску пацыента.

Урачы-тапаметрысты разам з тэрапеўтамі дакладна вызначаюць зону, якую неабходна апраменьваць, — гэта так званыя мішэні. А таксама крытычныя структуры, якія ні ў якім разе нельга пашкодзіць. Далей інфармацыя паступае да медыцынскіх фізікаў, што плануюць праграму прамянёвай тэрапіі. У клінічным заданні прапісваюцца рэжымы і дозы. Пасля таго як план складзены, ён прымаецца калегіяльна. Наступны этап — праверка плана, і толькі пасля гэтага пачынаецца лячэнне.

Асноўная яго частка адбываецца дзякуючы апарату пад назвай «гантры», які займае тры паверхі і важыць 200 тон. Гэта рухомая прылада, якая выкарыстоўваецца для ўтрымлівання і нацэльвання медыцынскага абсталявання на зафіксаванага пацыента. Менавіта яна дае магчымасць падвесці пучок пад любым градусам.

Пацыент размяшчаецца на стале, і спецыяльная сістэма дазваляе адсачыць нават моманты, калі чалавек дыхае і мішэні рухаюцца, і такім чынам падаць пучок менавіта тады, калі пацыент знаходзіцца нерухома, на ўдыху, каб не трапіць у зону з крытычнымі структурамі. Дзяцей малодшага ўзросту, якія не могуць доўга знаходзіцца нерухома, тут лечаць пад наркозам.

— Пацыентам неабходна своечасова праходзіць дыспансерызацыю і звяртацца да ўрачоў, і мы заўсёды пастараемся дапамагчы. У анкалогіі, калі мы змаглі падоўжыць жыццё мінімум на тры месяцы, значыць, сапраўды стараліся недарма, — сказаў напрыканцы сустрэчы Юрый Удалоў.

# МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

13 снежня 2023 г. № 45 (731)

Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ


ТЭМА НУМАРА

# ШТО МОЖА ДЭПУТАТ

**Ужо хутка, 25 лютага, у краіне пройдзе адзіны дзень галасавання. Упершыню мы адначасна будзем выбіраць дэпутатаў усіх узроўняў — ад Палаты прадстаўнікоў да сельскіх Саветаў. І калі заканатворчая дзейнасць першых вядомая, дык пра дэпутатаў мясцовых Саветаў некаторыя скептыкі (іх няшмат, але яны ёсць) гавораць: маўляў, яны мала што вырашаюць. З гэтым гатовы паспрачацца героі нашага сённяшняга спецвыпуску і тыя людзі, якім яны дапамагаюць на месцах вырашаць надзённыя пытанні. Нашы карэспандэнты ў рэгіёнах пагаварылі з народнымі выбраннікамі розных узроўняў — сельскага, раённага, абласнога. Ва ўсіх — свае задачы, а ідэя адна — быць побач са сваімі выбаршчыкамі і працаваць на іх карысць.**

ДЫЯЛОГ ПАКАЛЕННЯЎ

Наталля КАЧАНАВА:

# «ВЕЛЬМІ ВАЖНА, КАЛІ СЯБРУЕ МОЛАДЗЬ»

**Напрыканцы мінулага тыдня Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА правяла сустрэчу з кіраўніцтвам Маладзёжнага савета (парламента) пры Нацыянальным сходзе Беларусі і Палаты маладых заканадаўцаў пры Савеце Федэрацыі Федэральнага Сходу Расіі. Адбыўся шчыры дыялог, падчас якога Наталля Качанава расказала пра беларускі парламент і заканатворчасць, згадала сумесную гісторыю і юбілей вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, які наша краіна адзначыць у наступным годзе, закранула грамадска-палітычную сітуацыю, а маладыя парламентарыі задавалі свае пытанні і дзяліліся думкамі па актуальных пытаннях.**



Фота БелТА.



Спікер Савета Рэспублікі заўважыла, што такія сустрэчы з моладдзю ў верхняй палаце парламента праходзяць традыцыйна, а гэта мерапрыемства стала магчымым і дзякуючы таму, што паміж Саветам Рэспублікі і Саветам Федэрацыі і яго спікерам Валянцінай Матвіенка склаліся цёплыя сяброўскія адносіны. Далей яна звярнулася да агульнай гісторыі Беларусі і Расіі.

— У наступным годзе ў нас знакавая дата — 80-годдзе вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Мы адной ментальнасці, і тое, што нас злучала стагоддзямі, гэта агульная гісторыя. Мы не павінны яе забываць. І вельмі важна, калі сябруе моладзь. Тады відавочна, што ёсць перспектывы ў нашых краін, — адзначыла Наталля Качанава.

Яна расказала гасцям пра беларускі парламент, адзіны дзень галасавання, устаноўлены ў нашай краіне ў адпаведнасці з абноўленай Канстытуцыяй.

— Спадзяёмся, што адзіны дзень галасавання пройдзе зладжана і спакойна. Сітуацыя складваецца вакол Беларусі і Расіі няпростая, — падкрэсліла Наталля Качанава. — Вы бачыце, якія падзеі цяпер разгортваюцца на міжнароднай арэне, і мы разумеем, як сёння нялёгка адстойваць праўду. Нашу праўду, якая ёсць у Беларусі і Расіі. Шмат каго не задавальняе, што мы праводзім незалежную палітыку, але мы жывём у сваёй краіне і маем права развівацца так, як хочам таго мы. Палітыка павінна быць сумленнай і справядлівай. А справядлівасць — гэта тое, што сёння шануецца. Наш Прэзідэнт заўсёды гаворыць, што галоўнае — гэта чалавек і справядлівае стаўленне да ўсяго, — дадала яна.

Спікер адзначыла, што сёння ў свеце фашызм зноў паднімае галаву.

— Пасля стольких гадоў пасля заканчэння вайны мы вымушаны былі прымаць законы аб недапушчальнасці рэабілітацыі нацызму, аб генацыдзе беларускага народа. Калі б мне некалькі гадоў таму сказалі, што такое будзе, я б не паверыла: гэта за межамі дазволенага, — падзялілася яна, дадаўшы, што аднапалярнага свету ўжо няма і не будзе.

Падрабязна спікер Савета Рэспублікі спынілася на маладзёжнай палітыцы ў нашай краіне.

— У нас вялікая ўвага ўдзяляецца сацыяльнай сферы, сям'і, моладзі — гэта прыярытэтныя кірункі нашай дзяржаўнай палітыкі, роўна гэтак жа, як і ў Расійскай Федэрацыі. Члены Савета рэспублікі ўнеслі каля 100 прапаноў падчас падрыхтоўкі зменаў у Канстытуцыю, шэраг з якіх увайшоў у абноўлены варыянт. Адна з іх — тое, што ў Канстытуцыі павінен быць асобны артыкул, прысвечаны моладзі. Мы разумеем, што за моладдзю будучыня, і ад таго, наколькі правільна вы сёння ўспрымаеце рэальнасць, як ставіцеся да працэсаў, што адбываюцца, залежыць, як будуць заўтра развівацца Расія і Беларусь, як будзе жыць народ.

Наталля Качанава расказала пра дзейнасць Маладзёжнага савета пры Нацыянальным сходзе. Калі падчас першага склікання яго членамі былі 70 хлопцаў і дзяўчат, то ў другім скліканні кожны раён нашай краіны мае там сваіх прадстаўнікоў, а сталіца і абласныя цэнтры — па некалькі. Сёння ў маладзёжным парламенце працуе 138 маладых парламентарыяў.

— Мы запрашаем моладзь на ўсе нашы мерапрыемствы: пасяджэнні сесій, прыёмы грамадзян па асабістых пытаннях, пасяджэнні Саветаў па ўзаемадзеянні з мясцовымі органамі самакіравання. Я заўсёды іх заахвочваю: мы прымаем законы, і вы павінны бачыць, як яны рэалізоўваюцца і што зрабіць у краіне для развіцця маладзёжнай палітыкі, — удакладніла Наталля Качанава.

Яна запрасіла членаў Палаты маладых заканадаўцаў Расіі паўдзельнічаць у Форуме рэгіёнаў Беларусі і Расіі, які пройдзе ў наступным годзе ў Віцебску. Тыя прынялі запрашэнне і пацікавіліся яшчэ адным сумесным праектам — «Цягніком Памяці». Наталля Качанава паабяцала, што гэты знакавы праект будзе працягнуты.

**Алена КРАВЕЦ.**

ЧЫРВОНААРМЕЙСКАЯ, 9



## Навуковая кааперацыя, партыйныя арыенціры і гістарычная памяць

Падрабязнасці працоўнага тыдня сенатараў

● **Намеснік Старшыні Савета Рэспублікі Валерый БЕЛЬСКІ** прыняў удзел ва ўрачыстай цырымоніі ўручэння прэміі Саюзнай дзяржавы ў галіне навукі і тэхнікі. Ад імя Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь і яго Старшыні Наталлі Качанавай віцэ-спікер павіншаваў лаўрэатаў з прысуджэннем высокай узнагароды. У сваім выступленні сенатар зазначыў: «Такія дасягненні сталі магчымыя з прычыны цеснай кааперацыі навуковай супольнасці Расіі і Беларусі. Агульнай працай вучоных нашых брацкіх народаў куецца навуковы і тэхналагічны суверэнітэт, забяспечваецца пераадоленне санкцыйнага ціску і прыярытэт Саюзнай дзяржавы ў многіх сферах навукі і тэхнікі. Спадзяемся, што вашы вынікі стануць прыкладам для навуковых калектываў, якія і надалей будуць умацоўваць кааперацыйныя сувязі і ствараць на гэтай аснове інавацыйныя прадукты. Тым больш, што ў вучоных Беларусі і Расіі шмат зачынаў у сферах даследавання космасу, Антарктыкі, штучнага інтэлекту, нана- і аптычных тэхналогій, складанатэхнічнага машынабудавання, распрацоўкі сродкаў медыцынскай дапамогі і многіх іншых».

● **Член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве, старшыня РГА «Белая Русь», старшыня Беларускай партыі «Белая Русь» Алег РАМАНАЎ** прыняў удзел у першым пасяджэнні экспертна-аналітычнага цэнтра Беларускай партыі «Белая Русь», якое адбылося ў штаб-кватэры РГА «Белая Русь» у Мінску. Сярод экспертаў — вядучыя вучоныя з галіны гуманітарных, грамадскіх і прыродазнаўчых навук, а таксама паліталагі і грамадскія дзеячы. «Мы набліжаемся да электаральнай кампаніі — да адзінага дня галасавання, — адзначыў Алег Раманаў. — Беларуская партыя «Белая Русь» актыўна прымае ўдзел у гэтай рабоце. Экспертна-аналітычны цэнтр стане інтэлектуальным ядром партыі і будзе генераваць ідэі, неабходныя для далейшага яе развіцця. Адна з галоўных задач новай структуры — фарміраванне стратэгіі партыі на некалькі гадоў наперад, абапіраючыся на навуковыя даследаванні. Агульнавядома, што найбольш моцныя ідэі нараджаюцца на стыку навук. Сёння мы маем патрэбу ў сур'ёзнай інтэлектуальнай, тэарэтычнай, духоўнай аснове для свайго развіцця. На рэгулярных пасяджэннях эксперты цэнтра зоймуцца генерацыяй канкрэтных планаў і праектаў. У перспектыве, вынікі гэтай сумеснай працы могуць быць выкарыстаны як грамадзянскай супольнасцю, так і дзяржавай». На першым пасяджэнні экспертна-аналітычнага цэнтра абмяркоўвалася пытанне, звязанае са стварэннем адзінай праграмы для кандыдатаў у дэпутаты ад Беларускай партыі «Белая Русь». Праграма партыі будзе напоўнена тымі сэнсамі, якія будуць аб'ядноўваць усіх людзей і вылучэнцаў Беларускай партыі «Белая Русь». Людзі, якія будуць вылучацца ад імя партыі ад кожнага рэгіёна нашай краіны, зойдуць у электаральную кампанію з дакладнымі арыенцірамі і прапановамі.

● **Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці, дырэктар сярэдняй школы № 14 Маладзечна Каліна КАПУЦКАЯ** выступіла ў ролі аднаго са спікераў на дыялогавай пляцоўцы «Генацыд — памяць і боль беларускай зямлі». У абмеркаванні трагічных падзей нашай гісторыі, а таксама неабходнасці захавання памяці аб ахвярах нямецка-фашысцкіх захопнікаў сярод мірнага насельніцтва прынялі ўдзел выхаванцы ваенна-патрыятычных клубаў раёна, прадстаўнікі Маладзёжнага парламента. Удзельнікі мерапрыемства ўшанавалі памяць ахвяр злачынстваў генацыду хвілінай маўчання, затым наведалі Залу памяці ахвяр генацыду беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны «Разарваныя душы» і народны музей памяці воінаў-інтэрнацыяналістаў, якія працуюць у СШ № 14 Маладзечна.

**Вераніка КАНЮТА.**

# ЖЫЦЦЁВЫ ПРЫКЛАД ПАСТАЯННАЙ РАБОТЫ

## Дэпутатаў аблсавета добра ведаюць у іх раёнах

**ДЗЕЙНАСЦЬ мясцовых Саветаў дэпутатаў заўсёды знаходзіцца ў полі зроку жыхароў таго ці іншага рэгіёна. І гэта зразумела, бо дэпутат, асабліва для сельскага насельніцтва, быў і застаецца надзейным чалавекам, да якога можна звярнуцца па дапамогу. Старшыня Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў Уладзімір ЦЯРЭНЦЬЕЎ расказаў аб асноўных кірунках работы аблсавета і ролі народных выбраннікаў у мясцовым самакіраванні.**



**— Уладзімір Уладзіміравіч, раскажыце аб рабоце дэпутатаў паўночнага рэгіёна.**

— Аб тым, як працуюць дэпутаты, сведчыць апошняя прамая лінія старшыні аблвыканкама. Пасля вялікага снегападу, які на працягу тыдня засыпаў рэгіён, людзі амаль не звanілі з прычыны непачышчаных дарог. З улікам таго, што для нас пачышчаныя дарогі — гэта там, дзе можа праехаць аўтакрама і прывезці хлеб, ці там, дзе людзі могуць дайсці да ФАПа, а дзеці могуць прыехаць у вёску праведаць старых бацькоў. Калі такіх званкоў са скаргамі не паступала, гэта гаворыць аб адным: нашы старэйшыны і старшыні сельскіх Саветаў сёння працуюць. Гэта яркі жыццёвы прыклад пастаяннай работы. Менавіта старшынь сельскіх Саветаў мы сёння можам назваць «соллю зямлі», на іх усё трымаецца. І ад таго, каго мы сёння выберам, хто будзе працаваць далей, залежыць будучыня населеных пунктаў і ўсе пытанні, якія цяпер вырашаюць Саветы.

Арганізацыя пахавання пачэснага грамадзяніна раёна, абрывы на лініях электраперадач, прарвала трубы і няма вады — усім гэтым у першую чаргу разам са спецыялістамі на месцах займаюцца старшыні раённых і сельскіх Саветаў.

Магчыма, дэпутатаў абласнога Савета ў вялікіх гарадах відаць не так, як у раёне. Як правіла, праблемы гараджан не такія глабальныя і вырашаюцца мясцовымі ўладамі хутчэй, а на вёсцы па дапамогу да прадстаўнікоў дэпутацкага корпуса ідуць тады, калі пройдзены ўсе інстанцыі беспаспяхова. Многія жыхары горада не ведаюць прозвішча ўчастковага інспектара міліцыі, але гэта не значыць, што ён не працуе. Гэта толькі пацвярджае факт, што мясцовыя органы ўлады аператыўна адгукаюцца на праблемы, не даводзячы сітуацыю да крайняй інстанцыі. Тое самае і з дэпутатамі: калі іх работа не бачная, значыць, у людзей не было неабходнасці звяртацца.

У Лёзне сёння ўсе ведаюць Алега Валянцінавіча Жынгеля, у Мёрах — Уладзіміра Сямёнавіча Мацвеева, у Расонах — Галіну Пятроўну Жаланаву. І такіх дэпутатаў аблсавета, якія за доўгія гады заслужылі сярод насельніцтва аўтарытэт, даволі шмат. Па выніках мінулых выбараў 50 працэнтаў абласнога дэпутацкага корпуса было абноўлена, а 30 дэпутатаў засталіся перадаваць вопыт.

**— Якімі якасцямі павінен валодаць чалавек, які вылучае сваю кандыдатуру на выбарах?**

— Дэпутат у першую чаргу — гэта кіраўнік. Сёння ў грамадстве ўзнікаюць спрэчкі, чаму сярод дэпутатаў мала рабочых, служачых. Але калі ставіцца пытанне, хто будзе балатавацца, насельніцтва само вылучае ў першую чаргу лідара, які можа вырашыць пытанні лабіравання інтарэсаў таго ці іншага раёна. Даволі вядомы сёння ў Віцебскім раёне Юрый Адамавіч Дзядзёла. З аднаго боку, ён начальнік галоўнага ўпраўлення ЖКГ Віцебскага аблвыканкама, а, з другога боку, як дэпутат аблсавета па Віцебскім раёне аказвае значнае садзейнічанне ў вырашэнні праблем сферы жыллёва-камунальнай гаспадаркі насельніцтву Суражскага краю. Таму, безумоўна, прадстаўлены павінны быць усе, але так склалася, што людзі хочуць бачыць аўтарытэтных кіраўнікоў, якія могуць аказаць рэальную дапамогу. І дэпутаты аказваюць садзейнічанне.

Калі гаварыць аб дэпутатах Нацыянальнага сходу, то іх работа з людзьмі падчас прамых ліній, прыёмаў эфектыўная, дапамагае зразумець праблемы насельніцтва, што не вырашаюцца ў той ці іншай акрузе, а самае галоўнае — дазваляе заўважыць недапрацоўкі ў заканадаўстве. І менавіта ўдасканаленне законапраектаў з'яўляецца галоўным кірункам дзейнасці сенатараў. Туды павінны ісці людзі, якія маюць багаты вопыт работы не толькі ў юрыдычнай галіне, але і ў сферы адукацыі, культуры, бо штогод прымаюцца законапраекты вузкай накіраванасці. Таму ў першую чаргу трэба выбіраць чалавека, які будзе выдатным спецыялістам у сваёй сферы і літаральна «хварэць» справай. Такія людзі сёння ёсць, і за іх трэба галасаваць. Калі ў нашай краіне сёння змяняецца заканадаўства і яно працуе для грамадзян і вырашае іх праблемы, значыць, мы працуем у правільным кірунку і выбіраем тых дэпутатаў.

**— Раскажыце аб найбольш важных прыкладах паспяховай дэпутацкай дзейнасці.**

— У Лёзненскім раёне на працягу дзесяцігоддзяў былі вялікія праблемы з вадой, якія патрабавалі не толькі фізічных, але і буйных фінансавых уліванняў. Водаканал, ЖКГ не ішлі насустрач мясцовым жыхарам. Дзякуючы старшыні Лёзненскага раённага Савета дэпутатаў Тамары Леанідаўне Дрылёнак, якая біла ў званы, і дэпутату аблсавета Алегу Валянцінавічу Жынгелю, які на кожным пасяджэнні ўставаў і гаварыў, што лёзненцам патрэбна чыстая вада, пытанне вырашылася. Былі знойдзены фінансы, заменена некалькі кіламетраў труб, пабудаваны станцыі ачысткі і абезжалезвання — праведзены цэлы комплекс работ, каб чыстая вада нарэшце прыйшла ў сам раённы цэнтр, аграгарадок Зубкі і яшчэ дзясятак населеных пунктаў побач. І гэта не адзін яркі глабальны прыклад, калі дэпутацкі корпус вырашыў праблему соцень жыхароў раёна.

Не менш важную работу ў Расонах праводзіць Галіна Аляксееўна Падвіцельская, якая паралельна з'яўляецца старшынёй раённай арганізацыі Чырвонага Крыжа. Заўсёды выязджаючы на прыёмы грамадзян, яна не толькі дапамагае людзям вырашыць іх праблемы, але і працягвае руку дапамогі шматдзетным сем'ям, пажылым, тым, хто пражывае адзін і мае патрэбу ў адзенні, прадуктах, леках.

Старшыня Браслаўскага райсавета Ніна Антонаўна Пучынская разам са старшынямі сельскіх Саветаў у сваёй дэпутацкай рабоце нацэлена на добраўпарадкаванне населеных пунктаў раёна. Знаходзяцца сродкі і бюджэтныя, і пазабюджэтныя. З грантавай падтрымкай устанаўліваюць дзіцячыя пляцоўкі, ачышчаюць берагавую лінію, добраўпарадкоўваюць пляжы. Невыпадкова на працягу апошніх дзесяці гадоў Віцебшчына з'яўляецца лідарам па колькасці аграгарадкоў, якія займаюць прызавыя месцы ў рэспубліканскім конкурсе па добраўпарадкаванні. І гэта наш гонар, напрацаваны дэпутатамі розных узроўняў з мэтай павышэння якасці жыцця грамадзян.

На тэрыторыі вобласці паўтары тысячы помнікаў і мемарыялаў, прысвечаных загінулым воінам і ахвярам фашызму гадоў Вялікай Айчыннай вайны. Пераважная колькасць іх знаходзіцца ў сельскай мясцовасці, менавіта дэпутаты дзякуючы самаабкладанню, спонсарскай дапамозе ўтрымліваюць помнікі і воінскія пахаванні. Летась завяршылася буйная рэканструкцыя Заронаўскага мемарыяла, дзе пахавана больш за 10 тысяч байцоў. У гэтым годзе ў вёсках Заронава і Пестуніца былі адкрыты помнікі на брацкіх магілах. І такіх прыкладаў вельмі шмат.

Дзякуючы дэпутацкім запытам, сёння ідзе асфальтаванне мясцовых дарог, нават з пытаннямі па грэйдзіраванні сельскіх дарог людзі ў першую чаргу звяртаюцца да дэпутатаў сельскіх і раённых Саветаў. Добраўпарадкаванне могілак таксама знаходзіцца ў полі зроку дэпутацкага корпуса.

Другі год у вобласці рэалізоўваюцца грамадзянскія ініцыятывы з прыцягненнем спонсарскай дапамогі. Многія ўнікальныя і патрэбныя праекты ў паўночным рэгіёне ўжо рэалізаваны, сёлета дэпутацкі корпус нацэлены на інклюзію, у першую чаргу дзіцячую. Дзяржава стварае ўмовы для сацыялізацыі дзяцей з асаблівасцямі здароўя, але калі ў нас ёсць магчымасць палепшыць безбар'ернае асяроддзе за кошт спонсарскіх сродкаў з мэтай павышэння якасці жыцця для такой катэгорыі насельніцтва, трэба гэту магчымасць выкарыстоўваць. Веласіпед для дзетак з ДЦП, домік савы для дзяцей з парушэннямі аўтыстычнага спектра, хлебная майстэрня для інвалідаў — толькі частка ўжо рэалізаваных праектаў у вобласці, работу ў такім кірунку плануем працягваць.

Трэба помніць, што ў мясцовых Саветах усе дэпутаты, акрамя старшыняў, працуюць на грамадскіх пачатках, і кожны з іх сёння з'яўляецца кіраўніком, які не толькі выконвае свае функцыянальныя абавязкі, але і знаходзіць час, каб займацца грамадскай дзейнасцю як дэпутат. І калі чалавек сапраўды аддана працуе як дэпутат, то гэта забірае шмат часу і сіл.

**Аляксандра ГВОЗДЗЕВА.**

# НЕ БЫЦЬ

**У Леаніда Дзівакова з Мастоў і Таццяны Казловай са Скідзеля розныя сферы дзейнасці. Магчыма, яны нават не знаёмыя, але маюць нямала агульнага. Абодва — дэпутаты са стажам, не адну выбарчую кампанію паспяхова прайшлі. Але галоўнае, што іх аб'ядноўвае — гэта сумленны падыход да сваіх заяўнікаў. Бо людзі, як правіла, звяртаюцца з самым набалелым.**

## «Кожную справу трэба даводзіць да канца»

Так лічыць дэпутат Мастоўскага раённага Савета дэпутатаў Леанід Дзівакоў. У 2008 годзе ён узначаліў Мастоўскі РЭС філіяла «Гродзенскія электрычныя сеткі» РУП «Гроднаэнерга». Уся яго працоўная дзейнасць звязана з энергетыкай.

Не першы год ён і ў дэпутацкім корпусе Мастоўскага раёна. За плячыма — некалькі выбарчых кампаній, прычым у розных акругах. Найбольшы дэпутацкі стаж — у Кастрычніцкай выбарчай акрузе, а на мінулых выбарах Леанід Паўлавіч быў абраны дэпутатам па Савецкай выбарчай акрузе горада Масты.

— Гэта цэнтр горада, тут знаходзіцца школа, аб'екты інфраструктуры, жылыя шматпавярхоўкі. Перад выбарамі я пазнаёміўся бліжэй з гэтай тэрыторыяй, праблемнымі месцамі. І ўжо падчас выбарчай кампаніі вызначыўся з праграмай. Яна датычыла канкрэтных аб'ектаў, а дакладна — прывядзення ў парадак трох жылых дамоў. Усе яны трохпавярховікі, і пабудаваны ў ліку першых дамоў у горадзе. За такі працяглы час эксплуатацыі дамы патрабавалі капітальнага рамонту, можна сказаць, поўнага аднаўлення, — расказаў дэпутат.

Паколькі дамы знаходзяцца ў самым цэнтры горада, пытанні па іх аднаўленні неаднаразова закраналіся падчас раённых сесій. Звярталіся да гарадскіх улад і жыхары дамоў з просьбамі звярнуць на іх увагу. Па хадайніцтве дэпутата Дзівакова, рашэннем сесіі гэтыя аб'екты былі ўключаны ў планы работ жыллёва-камунальнай гаспадаркі.

Згодна з праектам, заменены інжынерныя сеткі, поўнасцю аднавіўся фасад, пад'езды. Праведзена работа і па добраўпарадкаванні дваравой тэрыторыі — пракладзены

# ГАЛОЎНАЕ —

**У вёсцы кожны на віду, і быць народным абраннікам тут вельмі адказна. Калі нешта паабяцаў, але не зрабіў, людзі пакрыўдзяцца. Абедзве народныя абранніцы, пра якіх пойдзе размова, — прадстаўніцы Саветаў дэпутатаў сельскага ўзроўню. Іх дэпутацкі стаж болей, чым 10 гадоў, а гэта значыць, што яны ў аўтарытэце. У запісных кніжках мясцовых жыхароў тэлефон гэтых жанчын пад нумарам 1.**

## «У любым сельсавеце ёсць людзі, з якімі ўсё можна зрабіць»

**Старшыня Ракшанскага сельсавета Алена СЕЛЯЗНЁВА** ў дэпутатах вось ужо 13 гадоў. Прызнаецца, што, хоць і клопатныя гэтыя абавязкі, але ж прыемна, калі людзі падыходзяць і прапануюць і далей заставацца на народнай пасадзе. Яна ж жанчына мабільная, калі трэба, адразу села ў машыну і паехала справы вырашаць.

Пачынала з дэпутата, як яна кажа, вуліцы і дарасла ў гэтым статусе да сельскага ўзроўню. Зараз пад яе кіраўніцтвам 12 вёсак з колькасцю насельніцтва 1130 чалавек. У народныя абранніцы прыйшла, калі працавала настаўніцай беларускай мовы ў Мішнінскай сярэдняй школе. Пры такой пасадзе нават не трэба было знаёміцца з выбаршчыкамі. Усе і так яе ведалі. І першая справа, якую яна рабіла са сваімі актывістамі, — гэта ўстаноўка і афарбоўка агароджы вакол дзіцячай пляцоўкі. Жыхары Мішняў прасілі зрабіць гэта ў мэтах бяспекі. Далей — болей. Каля школы знаходзіцца вадаём. Разам высеклі кустоўе, прыбралі смецце — стала прыемна летам на беражку пасядзець.

— У любым сельсавеце ёсць людзі, з якімі ўсё можна зрабіць, — адзначае суразмоўніца. — Трэба толькі захацець. Людзі розныя, але адказных вельмі шмат.

Алена Селязнёва прызнаецца, што да таго, як стала дэпутатам, нічога пра гэтую дзейнасць не ведала. Усе пытанні сама вырашала, ніколі не хадзіла па інстанцыях з патрабаваннем — зрабіце мне тое або гэта. Калі было патрэбна, знаходзіла аднадумцаў — і наперад. Зараз з вышыні свайго вопыту прызнаецца, што дзесьці крыху шкадуе, што да свайго дэпутацтва з народнымі абраннікамі не сябравала. Разам маглі б зрабіць яшчэ больш.

У вёсках шмат пенсіянераў, людзей слабых і хворых, якім заўсёды дапамога патрэбна. І тут дробязяў не бывае. Зараз, напрыклад,

# АБЫЯКАВЫМ

## Дэпутаты раённых Саветаў Гродзеншчыны акрэслілі свае крэда ў рабоце з выбаршчыкамі



тратуарныя дарожкі, устаноўлены ліхтары. Увогуле, выгляд і двара, і дамоў кардынальна змяніўся. Людзі бачылі, што работа ідзе, таму скаргаў ад жыхароў па рамонце дома больш не паступала. А вось падзякі свайму дэпутату людзі выказвалі.

Зараз дэпутаты раёна аналізуюць, што зроблена за год. Таму на сесіі выносяцца пытанні, якія датычацца поўнага асваення сродкаў. Пры неабходнасці прымаюцца рашэнні па пераразмеркаванні фінансаў. Асаблівая ўвага надаецца аб'ектам, якія павінны быць здадзены да будучых абласных «Дажынак», месцам правядзення якіх абраны Масты. Самым знакавым аб'ектам павінен стаць сучасны стадыён. Адновіцца і знакаміты падвесны мост над Нёманам, які, дарэчы, знаходзіцца на тэрыторыі выбарчага ўчастка Леаніда Дзівакова. Таксама, згодна з рашэннем сесіі райсавета, кожная арганізацыя прадстаўляе свой праект падрыхтоўкі да «Дажынак».

Выбаршчыкі звяртаюцца да Леаніда Дзівакова і з пытаннямі, якія звязаны з яго прафесійнай дзейнасцю. Напрыклад, па замене ліхтароў, пераносе ліній электраперадачы і іншае. Прыходзіцца вырашаць і спрэчныя пытанні адносна гнёздаў буслоў, з якімі жыхары звяртаюцца да дэпутата-энергетыка.

— Па законе гнёзды буслоў варта здымаць з ліній электраперадачы, і такіх фактаў вельмі шмат. У нас распрацаваны пералік такіх месцаў. Часам людзі патрабуюць зняць гнёзды каля іх сядзіб, а іншыя, наадварот, супраць. Такім чынам, мы шукаем кампраміснае рашэнне. Напрыклад, вядзецца ўстаноўка пляцовак на электраапорах, каб гнёзды не перашкаджалі праводам, — расказвае дэпутат райсавета.

Па яго словах, многія пытанні дапамагаюць вырашаць трывалы вопыт работы з людзьмі, камунікатыўнасць. У характары дэпутата — даводзіць любую справу да канца. А яшчэ Леанід Паўлавіч — прыклад здаровага ладу жыцця. Ён рэгулярна наведвае басейн у новым спартыўна-аздараўленчым комплексе і нават удзельнічае ў спаборніцтвах па плаванні. Па яго словах, комплекс не пустуе, з кожным годам наведвальнікаў становіцца толькі больш.

### «Самая недапушчальная пазіцыя — быць абыякавым»

У дэпутата Гродзенскага раённага Савета дэпутатаў, дырэктара Скідзельскай СШ № 1 Таццяны Казловай, зона адказнасці — Кастрычніцкая выбарчая акруга № 5. Гэты раён горада-спадарожніка адметны сваёй новай забудовай. Шматпавярховікі, якія «растуць» па вуліцах Кастрычніцкай, Савецкай, Партызанскай, пастаянна папаўняюць жылы комплекс мікрараёна. У ліку 1,5 тысячы выбаршчыкаў значную частку складаюць маладыя сем'і, а таксама шматдзетныя.

Да нядаўняга часу існавала праблема недахопу дашкольных устаноў. У мінулым годзе яе ўдалося вырашыць. У мікрараёне ўступіў у строй дзіцячы садок на 190 месцаў. Гэта самы сучасны праект з басейнам, спартыўнымі і гульнявымі памяшканнямі і многім іншым.

Аднак так склалася, што СШ № 1 — найбліжэйшая ў мікрараёне. Дзве іншыя знаходзяцца ў розных частках горада. Сем'і, якія пражываюць у новым мікрараёне, імкнуцца адправіць сваіх дзяцей менавіта ў тую, што бліжэй. Узнікае нямала спрэчных момантаў.

— З пытаннямі па афармленні дзяцей у школу да мяне звяртаюцца не толькі як да дырэктара, але і як да дэпутата. Такім чынам, мая прафесійная дзейнасць цесна пераплятаецца з дэпутацкай. Заўсёды імкнуся вырашыць праблему тых, хто звярнуўся. Зараз так атрымалася, што наша школа перапоўнена. Колькасць вучняў перавысіла 900, у той час калі ў двух іншых школах вучацца па 400 школьнікаў. У сувязі з гэтым мікрараён падзялілі на тры часткі. Каб разгрузіць СШ № 1, трэба перанакіраваць патокі. Менавіта гэту праблему і прыдзецца вырашаць, — расказала Таццяна Мікалаеўна.

Яна нагадвае, што яе дэпутацкая дзейнасць цесна звязана з дзецьмі. Гэта і пытанні матэрыяльнай дапамогі шматдзетным, і работа з маламаёмаснымі сем'ямі, і з тымі, дзе бацькі не заўсёды выконваюць свае абавязкі. Выбарчая акруга знаёмая, за перыяд работы ў школе дэпутат ведае практычна ўвесь свой электарат. Па словах Таццяны Казловай, ёй складана раздзяліць дэпутацкія і прафесійныя абавязкі.

— З аднаго боку, гэта вельмі зручна — працаваць у адным раёне са сваімі выбаршчыкамі. Але трэба разумець, што гэта яшчэ і вельмі адказная работа. Але мне няцяжка. Магчыма, у сілу характару, але людзі давяраюць мне. Лічу, што для дэпутата недапушчальна — быць абыякавым. Такая пазіцыя павінна быць і ў кожнага кіраўніка, — лічыць дэпутат райсавета.

Вядома, яна ганарыцца тым, што дабілася рэканструкцыі сваёй школы. Будынак даволі стары, пабудаваны яшчэ ў канцы 50-х гадоў. Аднак пасля рамонту, які адбыўся некалькі гадоў таму, школа поўнасцю аднавілася, з'явіліся новыя прыбудовы — сучасная спартыўная зала, харчовы блок, майстэрні.

«Галоўнае, дэпутаты павінны разумець, што ў нас сацыяльна арыентаваная дзяржава, і дзейнасць дэпутацкага корпуса павінна быць накіравана на падтрымку сацыяльнай сферы», — упэўнена Таццяна Казлова.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**

# НЕ ПАДВЕСЦІ ЛЮДЗЕЙ

## Як у Мсціслаўскай глыбінцы дэпутаты дапамагаюць людзям вырашаць надзённыя пытанні

разбіраецца, чаму фельчар ФАПа ў аддаленыя вёскі не прывозіць лекі. Зімой пажылыя людзі самі на ФАП не ездзяць, чакаюць медыцынскай дапамогі дома.

Жыхары вёскі Пячонкі папрасілі дарогу пачысціць ад снегу. Алена Селязнёва звярнулася па дапамогу да кіраўніка мясцовага калгаса «Сцяг працы». А вось дапамагчы ў такім жа пытанні пенсіянерам з вёскі Башары старшыня папрасіла вучняў Андраноўскай школы з ліку валанцёраў БРСМ. У Башарах насельніцтва невялікае, усяго шэсць чалавек на трох вуліцах, да таго ж людзі немаладыя — па 60—80 гадоў.

Летам старшыня сельсавета разам з калегамі-дэпутатамі зрабіла камфортную зону для адпачынку ў Андранах. Гэта непадалёк ад рэчкі Кашанка, якая з-за дамбы пераўтварылася ў возера плошчай каля 10 гектараў. Там заўсёды вельмі шмат ахвотных адпачыць.

А ў Мішнях сёлета жыхары сабралі грошы і разам са старшынёй рамантавалі дзіцячую пляцоўку. Дэпутат сельсавета Наталля Сцяпанава і староста Людміла Іванова стварылі праект «Лепшае — дзецям!», які фінансава падтрымала Магілёўская абласная асацыяцыя мясцовых Саветаў дэпутатаў. На выдзеленыя грошы аграгарадок набыў арэлі.

На думку Алены Селязнёвай, дэпутат на вёсцы чалавек неабходны. Яго фінансавыя магчымасці, вядома, абмежаваныя, але ён заўсёды ведае, да каго звярнуцца па дапамогу, як падняць пытанне на раённым узроўні. Калі сам нешта не зробіць, іншага папросіць, і паступова праблема вырашыцца. Зняць градус напружання дапамагае чат у «Вайберы». У ім на прамой сувязі з Аленай Селязнёвай каля 60 чалавек. Працытавала некалькі зваротаў з перапіскі. «Аляксандраўна, заўтра ў Ракшына аўтакрама прыязджае. Хто дарогу чысціць?» Алена Селязнёва, яна ж Аляксандраўна, адразу пачала выбудоўваць лагістычныя ланцужкі.

Шмат хто з мясцовага насельніцтва на сувязі ў групе «Мішня — Андраны — Доўгавічы — краіна нашага дзяцінства» ў «Аднакласніках». Там таксама розны кантэнт. І аўдыё, і відэа, і «гарачыя» навіны.

Алена Селязнёва прызнаецца, што ёй вельмі дапамагаюць яе калегі. Усе дэпутаты сельсавета малайцы, адразу ж гатовыя прыйсці на выручку. А інакш і быць не можа. Стаў народным абраннікам — трымай статус з гонарам. «Ёсць такое слова — «трэба», — усміхаецца дэпутат. — Я тэлефаную калегам і кажу: «Нагадваю пра вашы дэпутацкія абавязкі». Гэта такі наш дэпутацкі гумар. Насамрэч нікому нічога нагадваць не трэба. Людзі нават у сельсавет не звяртаюцца, адразу ж да дэпутата або старасты. Дзмітрый Новік, напрыклад, вельмі часта асабіста пытанні вырашае. Тэлефануе толькі тады, калі нейкі інструмент патрэбны або ў адзіночку праблему не рашыць. Адна жыхарка паскардзілася яму, што пладовыя дрэўцы ў садзе няма каму падрэзаць. Ён сам прыйшоў і падрэзаў. Да яго і з іншых вёсак людзі звяртаюцца, ён едзе і дапамагае.

Жыхары вельмі сардэчна адносяцца да Алены Селязнёвай, кажуць, што чалавек на сваім месцы.

Надзея Антоненка — жыхарка Мсціслава, а ў вёсцы Доўгавічы, якая на тэрыторыі Ракшанскага сельсавета, жыла яе маці. Калі тая цяжка захварэла, даглядала яе. Са старшынёй сельсавета пазнаёмілася, калі маці памерла і спатрэбілася пасведчанне аб смерці. Заадно спыталася пра паклонны крыж. Маўляў, шкада, што вёска вымірае, калісьці тут багата было людзей. Старшыня не адмовілася дапамагчы, з таго часу Надзея Антоненка сувязь з Аленай Селязнёвай не губляе. Разам рабілі вялікую справу — ставілі агароджу на могілках, дзе пахаваныя землякі, у тым ліку і бацькі Надзеі Антоненкі. Старшыня паклапацілася жэрдкі дастаць, а людзі сабралі грошы на штыкетнік. Разам яго ўстанаўлівалі і фарбавалі. А які шыкоўны Дзень вёскі арганізавала народная абранніца. Такі, што цяпер уся вёска жыве чаканнем новага свята. Было шмат людзей, канцэрт. Даўно так весела тут людзі не адпачывалі.

— Алена Селязнёва вельмі добры дэпутат, — кажа Надзея Антоненка. — Калі нешта абяцае, заўсёды выконвае. Гэта вельмі важна, калі жадаеш мець аўтарытэт сярод людзей. І павінна быць дысцыпліна. Каб пракантраляваць, як пытанне вырашана. Тады за такім дэпутатам усе людзі пойдуць. У старшыні Ракшанскага сельсавета ўсе гэтыя якасці ёсць.

### «Наша старшыня — самы спагадлівы дэпутат»

Не менш адказная і актыўная **старшыня Падсолтаўскага сельсавета Аксана ЛІСОЎСКАЯ.** Яна заўсёды ў нейкіх справах. То на ферме, то на сходзе, то на ўборцы, то на выкліку. Пад яе кантролем 30 населеных пунктаў, дзе жывуць 1236 чалавек. Вырашаць праблемы людзей на месцах ёй дапамагае актыў: 17 старастаў, 11 дэпутатаў і орган тэрытарыяльнага самакіравання — Савет аграгарадка Падсолтава. Іх



работа распаўсюджваецца на ўсе населеныя пункты. Яны пастаянна на сувязі з сельвыканкамам, прысутнічаюць на пасяджэннях і сесіях. Падчас суботнікаў удзельнічаюць у добраўпарадкаванні сваіх населеных пунктаў: саджаюць дрэвы, прыбіраюць смецце, высякаюць кустоўе і скошваюць пустазелле, арганізуюць і падштурхоўваюць да навядзення парадку мясцовых жыхароў. Староста з аграгарадка Падсолтава Святлана Макароўская ў штогадовых спаборніцтвах займае прызавыя месцы, двойчы была ў прызёрах па вобласці. Не менш актыўныя старасты Аліна Мануйлава з вёсак Залессе і Пуцяты, Валянціна Бялова з вёскі Шамава і іншыя. Яны першыя памочнікі старшыні, у курсе ўсіх вясковых праблем: вырашаюць пытанні, звязаныя з водазабеспячэннем, нарыхтоўкай паліва, гандлёвым абслугоўваннем насельніцтва. На чале з Аксанай Лісоўскай наводзяць парадак і прыгажосць у населеных пунктах. Напрыклад, устанавілі дзве лаўкі каля паклоннага крыжа ў вёсцы Залессе, зрабілі дзіцячую пляцоўку і пасадзілі кветкі ў аграгарадку Курманава, паставілі памятны знак у вёсцы Багацькаўка.

— Наша Аксана Віктараўна — чалавек вельмі дзейны, — кажа **староста аграгарадка Падсолтава Святлана МАКАРОЎСКАЯ.** — Я яе яшчэ са школы ведаю. Заўсёды была актыўная, у мастацкай самадзейнасці ўдзельнічала. У горадзе, вядома, прасцей вырашаць жыццёвыя пытанні: той жа снег пачысціць або тэрыторыю абкасіць не праблема. У нас па-рознаму бывае. Але, дзякуючы нашай старшыні сельсавета, пытанні вырашаюцца. І мы ёй за гэта вельмі ўдзячныя.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

# ІДЭЙ ШМАТ, ТОЛЬКІ НЕ ЛЯНУЙСЯ

**Працаваць ва ўнісон, аказваць дапамогу адзін аднаму... На Гомельшчыне досвед работы з вясковымі актывістамі ў Буда-Кашалёўскім раёне чарговы раз даказвае: поспех у грамадскіх ініцыятывах абавязкова прыходзіць, калі людзі і каманда дэпутатаў мясцовага ўзроўню працуюць разам. Грамадзянскія ініцыятывы сёння — гэта сумесны пошук вырашэння любога хвалюючага пытання. З практыкі работы ў раёне адзначаюць, што асноўная частка мясцовых ініцыятыў датычыцца так ці інакш пытанняў добраўпарадкавання населеных пунктаў, развіцця іх сацыяльна значнага асяроддзя. За гэтым — не толькі ўдзел вяскоўцаў у суботніках, але і матэрыяльная, фізічная, інфармацыйная дапамога...**

## Трымай імпульс

— Людзі, калі прапаноўваюць ініцыятыву, заўсёды звяртаюцца і спадзяюцца на дапамогу мясцовай улады. У ініцыятыўных групах у населеных пунктах часта лідарам таксама выступае менавіта дэпутат. Ідэй у нашых людзей вельмі шмат, і важна тое, што іх ёсць з кім увасабляць у жыццё, — перакананы **старшыня Уваравіцкага сельскага Савета дэпутатаў Буда-Кашалёўскага раёна Віталь ПАНЦЯЛЕЕНКА**.

Гарадскі пасёлак Уваравічы на тэрыторыі Буда-Кашалёўскага раёна — прыклад стваральнай грамадзянскай актыўнасці. Толькі за апошнія гады ў населеным пункце ажыццявілі адразу некалькі сацыяльна значных праектаў: уладкавалі спартыўны гарадок, добраўпарадкавалі бегавыя дарожкі на стадыёне. Са школьнага спартыўнага пакоя, які быў аснашчаны толькі самаробнымі трэнажорамі, зрабілі сучасны спартыўны аб'ект для жыхароў усіх узростаў. У школе абсталявалі інфармацыйны цэнтр для правядзення мерапрыемстваў. Ва ўвасабленні ў жыццё гэтых праектаў актыўны ўдзел браў дэпутат Уваравіцкага сельскага Савета дэпутатаў, дырэктар Уваравіцкай сярэдняй школы Аляксандр Канцавенка.

Аляксандр Анатольевіч — адзін з васьмі дэпутатаў мясцовага ўзроўню Уваравіцкага сельскага Савета дэпутатаў. Цяпер уся іх дэпутацкая каманда ў чаканні ажыццяўлення чарговай сацыяльна значнай грамадзянскай ініцыятывы пад назвай «Трымай імпульс».

— Гэта ініцыятыва па адкрыцці варкаўт-зоны з трэнажорамі на розныя групы мышцаў. Пляцоўка ва Уваравічах рэальна патрэбна, чакаюць яе не толькі моладзь, але і людзі старэйшага пакалення. Размясціць яе плануем у цэнтры населенага пункта, каля існуючай дзіцячай пляцоўкі. Ужо цяпер людзі нашы цікавяцца ў дэпутатаў, якая канкрэтна патрэбная дапамога для адкрыцця пляцоўкі, гатовы паўдзельнічаць у ініцыятыве не толькі фінансава, але і фізічна папрацаваць падчас яе ўстаноўкі, — пацвярджае Віталь Панцялеенка.

Віталь Уладзіміравіч дадае: дэпутаты з іх сельскага Савета дэпутатаў — першыя памагатыя не толькі пры ажыццяўленні грамадзянскіх ініцыятыў, але і ў вырашэнні надзённых праблем: курыруюць пытанні і па аўтакрамах, асабліва ў аддаленых населеных пунктах, і вулічнага асвятлення. Важны ўдзел сельскіх дэпутатаў ва ўсіх мерапрыемствах, якія праходзяць на тэрыторыі сельсавета. У гэтыя апошнія надзвычай снежныя дні асабліва заўважна дапамога дэпутатаў мясцовага ўзроўню ў вырашэнні пытанняў з ачысткай ад наступстваў снегападаў тэрыторыі населеных пунктаў. Аляксандр Канцавенка, напрыклад, арганізоўвае і валанцёрскія групы па прыборцы снегу. Падтрымліваюць гэту ініцыятыву не толькі моладзь, школьнікі, але і проста неабыякавыя грамадзяне.

— Дэпутаты — гэта каманда, бо ў адзіночку, здараецца, вельмі цяжка вырашаць хвалюючыя пытанні. Дэпутаты вялікую ролю адыгрываюць у працэсе зносін з грамадзянамі, інфармацыйнай работы з імі, — падкрэслівае Віталь Панцялеенка.

## Не зарастае сцяжынка, пракладзеная дэпутатам

Ініцыятывы дэпутата па Кашалёўскай выбарчай акрузе Буда-Кашалёўскага райсавета дэпутатаў Аляксея Аўдашкова добра вядомыя і ацэненыя жыхарамі вёскі Кашалёва.

— На пустцы, дзе калісьці была школа, сваімі сіламі зрабілі спартыўную пляцоўку. Паставілі вароты для гульні ў футбол, турнікі, пляцоўку для валейбола, лаўкі. Сельвыканкам дапамог і агарадзіў тэрыторыю, атрымалася вельмі добрае месца для актыўнага адпачынку і заняткаў спортам, — распавёў дэпутат.

Аляксей Аўдашкоў ужо год як узначальвае Буда-Кашалёўскае дарожна-рамонтна-будаўнічае ўпраўленне № 184. У яго калектыве ёсць у тым ліку мясцовыя жыхары вёскі Кашалёва. Яны шчыра падтрымліваюць дэпутата ў рэалізацыі грамадзянскіх ініцыятыў на тэрыторыі іх населенага пункта.



Дэпутат Гусявіцкага сельскага Савета дэпутатаў Буда-Кашалёўскага раёна Людміла ГРЫШАЙ.



Актывістка ініцыятыўнай групы грамадзянскай ініцыятывы «Трымай імпульс» — загадчык філіяла Уваравіцкага гарадскога Дома культуры Людміла ЯКІМЕНКА і старшыня Уваравіцкага сельвыканкама Буда-Кашалёўскага раёна Віталь ПАНЦЯЛЕЕНКА на месцы, дзе плануюць адкрыць вясковую варкаўт-пляцоўку.

— У нашым калектыве адзін з супрацоўнікаў Павел Елісееў яшчэ ад свайго дзеда і бацькі ведаў гісторыю аб крыніцы, якая біла калісьці каля царквы ў вёсцы Кашалёва. Храм згарэў у вайну, пра крынічку забыліся, тэрыторыя, дзе, па ўспамінах старажылаў, яна знаходзілася, моцна зарасла. Але мы вырашылі адшукаць крыніцу. Старыя людзі падказалі: на тым месцы варта шукаць жолаб з выдзеўбленага дубовага бервяна. Мы гэту канструкцыю і адшукалі. Разам з мясцовымі жыхарамі вырашылі, што пачысцім і адновім крыніцу. Дамовіліся працаваць на выхадных, за трое выхадных усё зрабілі. Замянілі тую старую дубовую «трубу», укапалі калодзежныя бетонныя кольцы, зрабілі трубу для набору вады, паставілі вечка з металачарапіцы, каб не траплялa смецце. Ваду з крыніцы бралі на аналіз, каб праверыць яе якасць, і пераканаліся, што ўсё адпавядае нормам. Добраўпарадкавалі і тэрыторыю вакол: падсыпалі грунт, з бардзюраў зрабілі «пятачок», каб было зручней падыходзіць і браць ваду, праклалі дарожку. Калі праязджаю міма, заўсёды прыемна глядзець, што сцяжынка да крынічкі не зарастае, крынічка гэта карыстаецца вялікай папулярнасцю ў людзей, — вельмі цікава і з захапленнем расказвае аб іх грамадзянскіх ініцыятывах на вёсцы Аляксей Аўдашкоў.

Аляксей Іванавіч, дарэчы, падзяліўся, што вопыт дэпутацкай работы яму вельмі дапамагае і ў асноўнай рабоце кіраўніка раённага ДРБУ: знутры ведае, у якім населеным пункце ёсць найбольш вострая дарожная праблема.

## Мастачка з народа

Дэпутат Гусявіцкага сельскага Савета дэпутатаў Буда-Кашалёўскага раёна Людміла Грышай амаль дзесяць гадоў прапрацавала кіраўніком спраў у сельвыканкаме. Сёння працуе па сваёй першай спецыяльнасці. Яна настаўнік пачатковых класаў Гусявіцкай сярэдняй школы. Людміла Аляксандраўна адна з тых актыўных вяскоўцаў, хто шчыра падтрымлівае ўсе грамадзянскія ініцыятывы.

— У свой час у Лоеўскім педкаледжы вучылася па спецыяльнасці «Кіраўнік дзіцячай мастацкай студыі». Калі прыйшла працаваць у нашу школу, папрасілі размаляваць сцены. Гэта быў першы мой такі вопыт. Пасля гэтага стала прыгажосць і ў вёсцы наводзіць, — расказвае аб сваёй грамадзянскай ініцыятыве, якую працягвае ўжо некалькі гадоў, Людміла Грышай.

Рукой дэпутата ў роднай Гусявіцы размаляваны прыпыначны пункт, шахтавыя калодзежы, малыя архітэктурныя формы.

— Некалькі гадоў таму ў вёсцы мы вырашылі зрабіць незвычайную клумбу. З дошак вырабілі стылізаваную ваенную машыну, якую я таксама размалявала. У прычэп насыпалі грунт, пасадзілі кветкі, і саму машыну ўсталявалі на клумбе — атрымаўся такі шмат'ярусны кветнік. Вельмі многа за гэты час размалявала шахтавых калодзежаў. Сачу за тым, каб абнаўляць усе свае работы, падфарбоўваю іх. Людзі прыгажосць такую цэняць, часта — фатаграфуюць і выкладваюць у інтэрнэт. На прыпыначным пункце, які размалявала, менш і смецце кідаюць, — заўважае Людміла Аляксандраўна.

У яе малодшай дачкі, як падзялілася дэпутат, таксама ёсць схільнасць да малявання. Маці возіць яе займацца ў школу мастацтваў ва Уваравічы.

— Так што будзе каму сваю ініцыятыву перадаць у спадчыну, — смяецца дэпутат. — Галоўнае, каб наша вёска жыла, каб дзеці, моладзь наша вярталіся сюды жыць.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА,**
**фота з архіва герояў**

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

**РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.**

**Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

**Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»**

**Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.**

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by

(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

АДРАС РЭДАКЦЫІ:
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

**КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН** 311 17 35;
**e-mail:** info@zviazda.by

**Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 38200000007667 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, праспект Незалежнасці, 79/1.**

**Тыраж 10.312.** **Нумар падпісаны ў 19.30 12 снежня 2023 года.**

Бацькаўшчына. У пошуках страчанага

# СВЕДКІ ВІЦЕБСКАЙ ДАЎНІНЫ

**Выпраўляючыся ў чарговы раз у старажытны Віцебск, звернем сваю ўвагу на тых яго ўраджэнцаў, хто ў першую чаргу спрычыніўся да культуры, мастацтва, асветы... Такіх сыноў і дачок у славутага паселішча нямала. Пра некага напісана даволі шмат, а хтосьці яшчэ застаўся па-за шырокай увагай. Згадваючы многія імёны, пераконваешся, што працэс пошукаў землякоў падаецца ці не бясконцым.**




Віцебск. Сувенірная паштоўка. Пачатак XX стагоддзя.




Віцебск. Від на горад з моста. Пачатак XX стагоддзя.




Віцебск. Тэатр. Пачатак XX стагоддзя.

Сярод ураджэнцаў Віцебска літаральна асобнай кнігі варты жыццяпіс Васіля Іванавіча Сабольшчыкава, які нарадзіўся ў студзені 1813 года. Без гэтай яркай асобы нельга ўявіць гісторыю расійскага кнігазнаўства. Сабольшчыкаў — рускі бібліятэказнавец, архітэктар, ганаровы член Пецярбургскай акадэміі мастацтваў (1858). З 1834-га Сабольшчыкаў працуе ў Пецярбургскай Публічнай бібліятэцы. Заснаваў аддзел замежных кніг пра Расію (Rossica). У 1859–1862 гадах па праекту нашага земляка пабудавана новая чытальная зала ў двары Публічнай бібліятэкі. Васіль Іванавіч — аўтар наступных кніг, брашур, артыкулаў: «Некаторыя заўвагі з нагоды артыкула П. М. Строева аб простым і спрыяльным спосабе размяшчаць бібліятэкі вялікага памеру» (1856), «Аб уладкаванні грамадскіх бібліятэк і складанні іх каталогаў» (1859), «Агляд вялікіх бібліятэк Еўропы ў пачатку 1859» (1860), «Брытанскі музеум у Лондане і Імператарская публічная бібліятэка ў Пецярбургу» (1864), «Чарткоўская бібліятэка ў Маскве і Імператарская Публічная бібліятэка ў С.-Пецярбургу» (1864), «Успаміны старога бібліятэкара» (з прадмовай В. В. Стасава надрукаваны ў 1889 годзе — ужо пасля смерці Васіля Іванавіча) і інш. Пра Сабольшчыкава расказваецца ў кнізе У. Іваска «Жыццё і праца Васіля Іванавіча Сабольшчыкава, старшага бібліятэкара і архітэктара імп. Публічнай бібліятэкі» (Масква, 1914). Памёр легендарны бібліятэкар у 1872 годзе.

Віцебск — і радзіма вучонага-правазнаўца Арона Навумавіча Трайніна (нарадзіўся ў 1883 годзе). Закончыў Маскоўскі дзяржаўны ўніверсітэт. Хоць і ўдзельнічаў у студэнцкіх хваляваннях, быў пакінуты на кафедры. Спецыялізаваўся па крымінальным праве. Пачынаючы з 1909 года шмат друкаваўся па пытаннях юрыдычнай тэорыі і практыкі. Не ўступіўшы ў партыю камуністаў, многія гады ў перыяд Савецкай улады ўзначальваў у Маскоўскім універсітэце кафедру крымінальнага права. Што па тых часах было справай, лічыце, неверагоднай. Аўтар аднаго з першых універсітэцкіх падручнікаў «Крымінальнае права» (1929). Наш зямляк адным з першых як вучоны-юрыст адгукнуўся на тыя падзеі, што адбываліся ў Германіі з прыходам да ўлады нацыстаў. Напісаў работы «Крымінальная інтэрвенцыя» (1935), «Абарона міру і крымінальны працэс» (1937), «Крымінальная адказнасць гітлераўцаў» (1944) і інш. У 1945 годзе Трайнін прадстаўляў СССР у складзе чатырохбаковай Лонданскай камісіі па падрыхтоўцы Нюрнбергскага працэсу. Пасля і ўдзельнічаў у ім у якасці кансультанта з боку савецкага абвінавачвання. Арон Навумавіч быў абраны членам-карэспандэнтам АН СССР, узнагароджаны двума ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга. Высокія адзнакі не сталі ахоўнай граматай у часы, калі ў краіне разгарнулася барацьба з так званымі касмапалітамі. Шальмаванне і пустыя абвінавачванні скіраваліся і ў адрас Трайніна, калі следам за «справай урачоў» у 1952 годзе рыхтавалася «справа юрыстаў». Арона Навумавіча выключылі з універсітэта, пазбавілі права займацца навуковай дзейнасцю. Памёр Трайнін у 1957 годзе. Хіба не варта постаць такога нашага земляка асобнай кнігі?




Віцебск. Гогалеўская вуліца і кандытарская «Жан Альберт». Пачатак XX стагоддзя.




Віцебск. Успенскі сабор. Пачатак XX стагоддзя.

Алена Аркадзеўна Кабішчэр-Якерсон, якая нарадзілася ў Віцебску ў 1903, — сведка ўжо другіх падзей. Рускі савецкі мастак, жывапісец, графік. Вучылася ў Віцебску ў мастацкай студыі легендарнага Юдэля Пэна. У 1918–1921 гадах вучылася ў Віцебскім мастацкім вучылішчы. У 1921 годзе выйшла замуж за мастака Д. А. Якерсона (1896–1947), з якім пазнаёмілася яшчэ ў час вучобы ў студыі Ю. Пэна, і выехала ў Маскву. У 1921 –1923 гадах вучылася ў славутым ВХУТЕМАСе. Удзельнічала ў мастацкіх выстаўках з 1927 года. У 1925–1929 гадах працавала ў Маскве ў Дзяржаўным Цэнтральным музеі прыродазнаўства. З 1929 года — у фальклорным кабінеце Дзяржаўнай акадэміі мастацтваў. У 1930–1940-ыя гады выконвала скульптурныя, жывапісныя работы для розных устаноў. У 1950–1958 гадах працавала мастаком Маскоўскага аддзялення Мастацкага фонду СССР. Работы Кабішчэр-Якерсон захоўваюцца ў зборах шэрагу музеяў Расійскай Федэрацыі, у прыватных калекцыях. Пра мастачку з Віцебска — некаторыя старонкі ў кнізе Г. Казоўскага «Мастакі Віцебска. Іегуда Пэн і яго вучні», што пабачыла свет у Маскве ў 1992 годзе.

У Віцебску ў красавіку 1912 года нарадзіўся Якаў Іосіфавіч Волчак, рускі драматург, кінасцэнарыст, празаік. Закончыў Растоўскі дзяржаўны ўніверсітэт. У свой час былі добра вядомыя кнігі Якава Волчака — «Апавяданні пра капітана Бурунца» (1959), «Карай. Сын Карая» (1963), «Мае настаўнікі» (1963). Ураджэнец Віцебска — аўтар п'ес «Зазірнуць у калодзеж», «Судовая хроніка», «Палічымся славаю...», «Голас крыві», «Зволены і прызначаны», «ККД апантанасці». Некаторыя з тэатральных твораў наш зямляк напісаў у сааўтарстве. Літаратурная праца Я. Волчака была адзначана ў 1955 годзе прэміяй Саюза пісьменнікаў СССР і МУС СССР. Памёр Якаў Іосіфавіч у 1988 годзе.

Рускі літаратуразнавец Ілья Серман нарадзіўся ў Віцебску ў 1913 годзе. Удзельнічаў у Вялікай Айчыннай вайне, быў паранены. Узнагароджаны ордэнамі і медалямі. У 1944 годзе абараніў кандыдацкую дысертацыю. Працаваў у Лендзяржлітвыдаце. У 1949 годзе нашага земляка арыштавалі за «антысавецкую прапаганду». Болей пяці гадоў правёў у лагеры на Калыме. У жорнавы сталінскага лагера патрапіла і жонка Ільі Сермана. Пасля вызвалення вучоны працаваў у Пушкінскім доме (Інстытуце рускай літаратуры) у 1956 — 1976 гадах. Абараніў доктарскую дысертацыю па тэме «Руская паэзія XVIII стагоддзя» (1969). Выдаў кнігі «Паэтычны стыль Ламаносава» (1966), «Дзяржавін» (1967), «Рускі класіцызм» (1973). Быў адным з рэдактараў шматтомнай «Гісторыі рускай літаратуры» на французскай мове. З 1976 жыў у Ізраілі .

Шкада, што некаторыя са згаданых постацяў па-ранейшаму так мала згадваюцца альбо зусім невядомыя ў Беларусі. А ўсе яны сведкі віцебскай даўніны. «Маўклівыя» старыя паштоўкі адкрываюць нам і іх памяць. А калі следам яшчэ выправіцца ў грунтоўны гісторыка-краязнаўчы пошук, то ў розных матэрыялах, звязаных з легендарнымі асобамі нараджэннем з Віцебска, знойдзецца нямала дэталяў, згадак пра губернскі горад канца XIX — пачатку XX стагоддзя. Такі, які ён нам прадстаўляецца з рэпрадукцый, са старых паштовак.

**Кастусь ЛЕШНІЦА.**

*Паштоўкі з калекцыі лаўрэата Прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «За духоўнае адраджэнне» Уладзіміра ЛІХАДЗЕДАВА.*




Віцебск. Касцёл Святой Барбары. Пачатак XX стагоддзя.




Віцебск. Сувенірная паштоўка. Пачатак XX стагоддзя.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

## Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Слуцкий сыродельный комбинат» (продавец)

проводит открытый аукцион по продаже одним лотом

**комплекса зданий, сооружений и оборудования Узденского производственного участка ОАО «Слуцкий сыродельный комбинат»,**

расположенных по адресу: Минская область, Узденский район, пер. Колхозный, 13, в следующем составе:

| № п/п | Наименование |
|---|---|
| | **Здания и сооружения:** |
| 1 | Главный производственный корпус, площадь 3592,8 кв. м, инв. № 623/С-1096 (составные части и принадлежности: теневой навес, пристройка – 4 шт., навес, забор) |
| 2 | Гаражи, площадь 614,6 кв. м, инв. № 623/С-1097 (составные части и принадлежности: пристройка – 3 шт.) |
| 3 | Здание котельной, площадь 332,2 кв. м, инв. № 623/С-1098 (составные части и принадлежности: пристройка – 2 шт.) |
| 4 | Здание для мойки мусорных контейнеров, площадь 14 кв. м, инв. № 623/С-60710 (составные части и принадлежности: площадка для мусора) |
| 5 | Проходная, площадь 20,2 кв. м, инв. № 623/С-60709 |
| 6 | Дезбарьер, инв. № 623/С60711 (составные части и принадлежности: площадка) |
| 7 | Градирня (инв. № 000006У), площадь 42 кв. м, инв. № 623/С-60941 |
| 8 | Водонапорная башня (инв. № 000004У), высота 21,15 м, площадь 10,6 кв. м, инв. № 623/С-60930 |
| 9 | Противопожарная емкость, площадь 44 кв. м, инв. № 623/С-60931 |
| 10 | Противопожарная емкость, площадь 30 кв. м, инв. № 623/С-60932 |
| 11 | Артскважина, инв. № 623/С-60951 (инвентарный номер 000011У) (составные части и принадлежности: павильон для пульта управления) |
| 12 | Артскважина, инв. № 623/С-60952 (инвентарный номер 000012У) (составные части и принадлежности: павильон для пульта управления) |
| 13 | Артскважина, инв. № 623/С-60953 (инвентарный номер 000013У) (составные части и принадлежности: павильон для пульта управления) |
| 14 | Линия ЛЭС, протяженность 793,3 м, инв. № 623/С-60940 |
| 15 | Площадные сети канализации, протяженность 515,9 м, инв. № 623/С-60939 |
| 16 | Площадные сети водопровода, протяженность 668,2 м, инв. № 623/С-60938 |
| | **Оборудование:** |
| 17 | Котел паровой Е-1.0-09-ГЗ, 1992 г. в., заводской № 13051, рег. №25-21-836, инв. № 000185У |
| 18 | Котел паровой с газовой горелкой:<br>- котел паровой стальной КП-4.0-0.9, 2012 г. в., зав. № 37, рег. № 25-21-0838;<br>- горелка газовая ГБГ-3.5-0.5, зав. № 180, инв. № 000456У |
| 19 | Система учета газа в комплекте, инв. № 000457У |
| 20 | Система водоподготовки в комплекте с автоматикой, инв. № 000455У |
| 21 | Подогреватель-теплообменник размеры: 3,5*0,3 м, инв. № 000066У |
| 22 | Подогреватель-теплообменник размеры: 3,5*0,3 м, инв. № 000067У |
| 23 | Горелка газовая блочная ГБ-0.85-0.1 (к котлу Е-1.0-09ГЗ), инв. № 000501У |
| 24 | Горелка газовая блочная ГБ-0.85-0.1 (к котлу Е-1.0-09ГЗ), инв. № 000502У |
| 25 | ГРУ котельной (газорегулирующая установка), инв. № 000271У |
| 26 | Резервуар для хранения молока из нержавеющей стали, двустенный, объем V = 50 куб. м, инв. № 000375У |
| 27 | Резервуар для хранения молока из нержавеющей стали, одностенный, объем V = 5 куб. м, инв. № 003424 |
| 28 | Резервуар РВ-5 из нержавеющей стали, одностенный, объем V = 5 куб. м, инв. № 991001245 |
| 29 | Точка доступа ISCO-802/11а: автоматическая система контроля и учета электроэнергии (АСКУЭ), инв. № 000485У |
| 30 | Весы платформенные электронные НПВ = 5000 кг, с индикатором весоизмерительным Newton NT-200А, инв. № 000332У |
| 31 | Весы платформенные электронные НПВ = 5000 кг с индикатором весоизмерительным CAS СИ-2001А, инв. № 000428У |
| 32 | Емкость для хранения молока: из нержавеющей стали, одностенная, объем V = 5 куб. м, инв. № 000316У |
| 33 | Агрегат электронасосный ЭЦВ 6-6.5-120, инв. № 000019У |
| 34 | Резервуар Я1-ОСВ-4 (для хранения сливок): из нержавеющей стали, двустенный, объем V = 4 куб. м, инв. № 000161У |
| 35 | Резервуар Я1-ОСВ-6 (для хранения сыворотки): из нержавеющей стали, двустенный, объем V = 6 куб. м, инв. № 000265У |
| 36 | Резервуар Я1-ОСВ-6 (для хранения сыворотки): из нержавеющей стали, двустенный, объем V = 6 куб. м, инв. № 000266У |

Объекты недвижимости **№№ 1–10, 15** расположены на земельном участке с кадастровым номером **625650100005000060** *(право постоянного пользования, площадь 2,0535 га)* по адресу: Минская обл., Узденский р-н, г. Узда, пер. Колхозный, 13.

*Участок расположен в охранной зоне электрических сетей напряжением до 1000 вольт на площади 0,0521 га.*

Объект недвижимости **№ 11** расположен на земельном участке с кадастровым номером **625684200009000012** *(право аренды по 16.02.2073, площадь 0,1139 га)* по адресу: Минская обл., Узденский р-н, Узденский с/с, 21. *Земельный участок имеет ограничения в использовании в связи с расположением в зоне санитарной охраны источников питьевого водоснабжения на площади 0,1139 га).*

Объекты недвижимости **№№ 12, 13** расположены на земельном участке с кадастровым номером **625684200009000011** *(право аренды по 16.02.2073, площадь 0,4306 га)* по адресу: Минская обл., Узденский р-н, Узденский с/с, 20. *Земельный участок имеет ограничения в использовании в связи с расположением на природных территориях, подлежащих специальной охране (в зоне санитарной охраны источников питьевого водоснабжения) на площади 0,4306 га, в охранной зоне электрических сетей напряжением до 1000 вольт на площади 0,0320 га, в придорожной полосе (контролируемой зоне) автомобильной дороги на площади 0,4306 га.*

Начальная цена с НДС (20 %) – **2 606 784,00 бел. руб**.

Задаток 10 % от начальной цены – **260 678,00 бел. руб.**

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ОАО «Сбер Банк», г. Минск, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.

Победитель (единственный участник) аукциона оплачивает Организатору аукциона вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 3 (трех) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона.

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by.

Аукцион состоится **15.01.2024** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **12.01.2024** до **17.00** по указанному адресу **в каб. 320**.

**Тел.: (8017) 516-80-65, 516-80-64, (8029) 102-21-17, телефоны для осмотра: 8029-151-05-97, 8029-760-17-14, 8017-18-56-179.**

УНП 600119098

## ООО «Фрондера» извещает о проведении публичных торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества ООО «СельэнергоПром»

| Лот | Наименование | Начальная цена без учета НДС, бел. руб. | Задаток, бел. руб. | Шаг аукциона, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | **Автоматическая линия окраски, модель SKNG, инв. № 6312** | **153,35** | **15,34** | **7,67** |

В отношении вышеуказанного имущества проводятся восьмые повторные торги. **Стоимость снижена на 99 %.** Ранее публикация размещалась в газете «Звязда» № 82 (29962) от 02.05.2023, стр. 6, № 106 (29986) от 06.06.2023, стр. 6, № 121 (30001) от 27.06.2023, стр. 4, № 136 (30016) от 18.07.2023, стр. 14, № 150 (30030) от 05.08.2023, стр. 14, № 165 (30045) от 26.08.2023, стр. 6, № 206 (30086) от 24.10.2023, стр. 10, № 229 (300959) от 25.11.2023, стр. 6

**Местонахождение:** Минская область, Смолевичский район, деревня Полевая, база ООО «Агрохлеб»

| | |
|---|---|
| **Дата и время проведения торгов** | **27 декабря 2023 года в 15.00 (регистрация с 14.30 до 14.55)** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127 |
| **Срок приема заявлений и внесения суммы задатка** | **с 10.00 14 декабря 2023 года до 16.00 26 декабря 2023 года** |

**Условия для участия в торгах:**

1. До подачи заявления необходимо внести задаток на р/с **BY36ALFA 30122215570040270000**, код банка ALFABY2X, УНП 192789344. Получатель – ООО «Фрондера», назначение платежа: **OTHR 40901.** Задаток для участия в торгах по Лоту 1, ООО «СельэнергоПром», проводимых 27.12.2023.
2. Заявление на участие (на каждый лот отдельное) и необходимые документы (соглашение о правах и обязанностях сторон в 2-х экземплярах (на каждый лот отдельное), копия платежного поручения о перечислении задатка, копия паспорта (стр. 31–33, действующая прописка); копия свидетельства о государственной регистрации – для ИП и юр. лица; документ, подтверждающий полномочия руководителя или представителя юр. лица, копия Устава – для юр. лица) принимаются в рабочие дни с 10.00 до 18.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127. Документы могут подаваться посредством направления почтой (220113, г. Минск, а/я 524) или личной подачи. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата и время получения организатором торгов оригинала заявления на участие в аукционе и полного пакета прилагаемых документов (в случае направления почтой – дата и время поступления документов на абонентский ящик организатора торгов). По вопросу подготовки необходимых документов для участия в аукционе обращаться по телефонам: +375293082897, +375293058650.
3. К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору торгов в указанный в извещении о проведении торгов срок заявление с приложением необходимых документов и зарегистрированные в журнале регистрации на участие в торгах. Победителем аукциона признается участник, предложивший в ходе торгов наивысшую цену. Результаты торгов оформляются протоколом в день проведения торгов.
4. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, при согласии этого участника приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %, комиссия в день проведения аукциона оформляет протокол о продаже предмета торгов этому участнику аукциона.
5. Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона (вознаграждение аукциониста и затраты по размещению публикации в газете) на основании счета-фактуры и акта в течение 5 (пяти) календарных дней со дня проведения аукциона. **Вознаграждение аукциониста – 7 % от конечной цены предмета торгов.**
Победитель аукциона (Претендент на покупку) должен подписать с Продавцом договор купли-продажи предмета торгов после возмещения затрат на организацию и проведение аукциона в течение 5 (пяти) рабочих дней с момента подписания протокола о результатах торгов. Оплата приобретенного предмета торгов должна быть произведена в полном объеме не позднее 5 (пяти) рабочих дней со дня заключения договора купли-продажи. Покупатель должен принять предмет торгов не позднее 30 (тридцати) календарных дней после оплаты в полном объеме по договору купли-продажи.
6. Подробнее с правилами проведения торгов можно ознакомиться в разделе «Ликвидация» на сайте https://orgtorg.by/info/.
7. Все желающие могут предварительно ознакомиться с предметом торгов. Контактное лицо для осмотра предмета торгов – **Ус Сергей Николаевич, +375293285550.** Дополнительная информация по предмету торгов – **Андрей, +375293042560.**
8. Организация и проведение аукциона осуществляется на основании норм положения «О порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов», утвержденного постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16.

| | |
|---|---|
| **Информация о продавце** | **ООО «СельэнергоПром» в лице ликвидатора – ООО «С чистого листа», тел. (8-044) 751-38-92 (222201, Минская область, г. Смолевичи, ул. Торговая, д. 20, комн. 1, УНП 691744416)** |
| **Организатор аукциона** | **ООО «Фрондера», 220113, г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127, ☎ тел. 8 (029) 308 28 97 • e-mail: info.torgi@orgtorg.by • сайт https://orgtorg.by • telegram https://t.me/orgtorg** |

ИНДУСТРИЯ ИННОВАЦИЙ юридическая компания

- Взыскание задолженности
- Проведение торгов
- Ликвидация
- Юридические услуги

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПУБЛИЧНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ (АУКЦИОНА)

| | | | |
|---|---|---|---|
| **Организатор публичных торгов (аукциона)** | ООО «Индустрия Инноваций», г. Минск, Старовиленский тракт, д. 10, пом. 4Н. Сайт в интернете: www.iin.by, https://iintorgi.by | | |
| **Продавец** | ОАО «Беларусьрезинотехника», УНП 700069297, 213829, Могилевская область, г. Бобруйск, ул. Минская, д. 102 | | |
| **Первые публичные торги (аукцион) в процедуре экономической несостоятельности (банкротства) по делу № 15-11/Б/2019 в экономическом суде Могилевской области** | | | |
| **Предмет публичных торгов (аукциона)** | | | |
| 1 | Участок ремонта тары, корпус № 79А, место расположения: Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Минская, 102Д/3 | 166 920,00 | 116 844,00 |
| 2 | Насосная при 3-секционной градирне, корпус № 69Б, место расположения: Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Минская, 102Д/6 | 192 720,00 | 134 904,00 |
| **3** | 2-секционная градирня подземного железобетона, корпус № 69В, место расположения: Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Минская, 102Д/4 | 366 000,00 | 256 200,00 |
| **4** | 3-секционная градирня, корпус № 69А, место расположения: Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Минская, 102Д/5 | 285 600,00 | 199 920,00 |
| **Задаток 10 %** от начальной цены предмета публичных торгов (аукциона) в белорусских рублях перечисляется на р/с BY48OLMP30123000945640000933 в ОАО «Белгазпромбанк», БИК OLMPBY2X, УНП 291442411, получатель платежа **– ООО «Индустрия Инноваций»** | | | |
| **Шаг электронных торгов** – 5 % от начальной цены лота. В случае отсутствия ставок участников торгов начальная цена торгов поэтапно снижается равными долями 5 (пять) раз до минимальной цены или до момента совершения ставок участниками торгов | | | |
| Условия участия и порядок проведения публичных торгов (аукциона) размещены в открытом доступе на официальном сайте электронной торговой площадки «Индустрия Инноваций – Торги» https://iintorgi.by и на официальном сайте ООО «Индустрия Инноваций» www.iin.by | | | |
| **Срок заключения договора купли-продажи: не позднее 10 (десяти) календарных дней** со дня подписания протокола о результатах торгов | | | |
| **Условия оплаты предмета электронных торгов: не позднее 30 (тридцати) календарных дней** со дня проведения торгов. Переход права собственности – после полной оплаты Имущества, с момента государственной регистрации перехода права собственности органом, осуществляющим государственную регистрацию недвижимого имущества, прав на него и сделок с ним | | | |
| **Торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «Индустрия Инноваций – Торги», размещенном по адресу:** https://iintorgi.by | | | |
| Победитель публичных торгов (аукциона) либо единственный участник публичных торгов (аукциона), согласившийся повысить начальную цену предмета торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить аукционисту торгов вознаграждение в размере **2 % от цены продажи лота в течение 3 (трех) рабочих дней** после проведения публичных торгов (аукциона) | | | |
| Организатор публичных торгов (аукциона) имеет право снять предмет аукциона с торгов, но не позднее чем за 3 дня до наступления даты проведения торгов (аукциона) | | | |
| **Дата и время проведения торгов (аукциона):** 15.01.2024, начало торгов: 10.00, окончание торгов: 16.00, электронные торги продлеваются на 3 минуты с момента поступления последней ставки, если ставка сделана менее чем за 3 минуты до времени окончания торгов. Заявки на участие в публичных торгах (аукционе) принимаются по 12.01.2024 г. до 16.00 | | | |
| **Контактные данные** | **Тел.: +375 17-300-90-03; +375 (29) 671-83-95; e-mail: e.pinchuk@iin.by** | | |

## ИЗВЕЩЕНИЕ о проведении первых повторных электронных торгов № 2023.Б.002.00146

Коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга» извещает о проведении первых повторных электронных торгов по продаже имущества, принадлежащего **обществу с ограниченной ответственностью «ВудСтандарт»,** УНП 391625085, в отношении которого открыто производство по делу об экономической несостоятельности (банкротстве) № 152Б2355 в экономическом суде Витебской области.

Номер лота, вид выставляемого на электронные торги имущества:

**Лот № 1. Недвижимое имущество.**

**Информация о предмете торгов, в т. ч. место нахождения.**

Здание зерносклада общей площадью 857,3 кв. м, назначение – здание специализированное растениеводства, составные части и принадлежности: 2 навеса, эстакада, по адресу: Витебская обл., Поставский р-н, Лынтупский с/с, 8, вблизи д. Новосёлки – 2, инв. № по бухг. учету – 00-000011.

**Начальная цена: 18 900,00 бел. руб. без НДС.**

**Минимальная цена: 12 600,00 бел. руб. без НДС.**

Размер шага составляет 5 процентов от начальной цены лота.

Обременения – нет.

Дата и время начала и завершения первых повторных электронных торгов: **28.12.2023 с 9.00 до 16.00**.

Электронные торги проводятся на электронной торговой площадке государственного предприятия «Витебский областной центр маркетинга» по эл. адресу http://etpvit.by/.

Прием документов осуществляется на ЭТП по эл. адресу http://etpvit.by **по 16.00 27.12.2023.** С подробной информацией о предмете торгов, условиями эл. торгов, порядке участия и оформления документов для участия в электронных торгах, размере задатка и реквизитах для его перечисления можно ознакомиться на сайте ЭТП ETPVIT.BY, по электронному адресу: https://etpvit.by, в разделе: «Недвижимое имущество – складские, производственные здания и помещения». Для участия в эл. торгах на ЭТП по эл. адресу http://etpvit.by/ необходимо ознакомиться с вышеуказанной информацией и подать заявку на участие в эл. торгах, пройти аккредитацию в качестве участника электронных торгов, а также перечислить задаток в срок **до 16.00 27.12.2023.**

Конт. тел. антикризисного управляющего +375 (29) 680-72-22.

Конт. тел. для осмотра объектов +375 29 5335529.

Конт. тел. лица, организующего торги на основании договора поручения: 8 (0212) 24-63-12, 8 (029) 510-07-63.

Хто каго?

# «ГЛЯДЖУ НА БОТЫ, НОЖКІ, БРУК... ЯК ПАДШЫВАНЕЦ, ЯК ХЛАПЧУК...»



**Божухна, як пралятае час! З гадамі толькі тое і робіш, здаецца, што прыбіраеш ёлку ды разбіраеш... Карацей — хутка зноў у лазню.**

**Туды, як вы памятаеце, вельмі шмат хто ходзіць 31 снежня, бо гэта ўжо традыцыя. Цяпер, яна, праўда, трохі змянілася: з таго ж 31-га шмат хто ходзіць без... грошай. Што, напэўна, заканамерна — святы, падарункі, госці. Нехта да нас, да некага мы — пехатой, на кані, на машыне, у новых боціках (для жанчын гэта, кажуць, лекі, а на леках не эканомяць!), у валёнках...**

**Вы ўжо глянулі на верхні здымак і зразумелі, што сёння гутарка (а павядуць яе, ну, вядома ж, чытачы «Звязды»!) пра самае галоўнае! («Рух — гэта жыццё», — пачула адна жанчынка і пайшла на каток. Пакаталася там на каньках, потым — на каленях, потым — тварам па лёдзе, а ўрэшце — на «хуткай» — у бок найбліжэйшай бальніцы.)**

**Але ж зараз не пра яе.**

«Модна цяпер праводзіць розныя тэсты, — у першых радках свайго ліста піша **спадар Валерый Гаўрыш з Чавусаў**. — Ну, вось напрыклад: кампаніі маладых (ці не вельмі) прапануецца «набор» з адмысловых рознакаляровых фігур. Нехта выбірае сабе чорны квадрат, нехта — жоўты круг, чырвоны трохкутнік, зялёны авал... І такім чынам «гаворыць» іншым, што ён за чалавек, які ў яго настрой, як ён можа павесці сябе ў пэўных абставінах...»

Нешта падобнае, як лічыць Валерый Мікалаевіч, прапануецца і на здымку, што, згадзіцеся, цалкам лагічна:

*Калі на спадцічку*
*ты глядзіш ўпарта,*
*Значыцца, сяброўку*
*ўжо заводзіць варта.*
*А калі спачатку*
*позірк на валёнкі,*
*Каб нацерла спіну,*
*папрасіся ў жонкі.*
*Калі ж ты вачыма*
*выбіраеш колы,*
*То — чакай —*
*даішнік*
*спыніць невясёлы.*
*Ён цябе адпусціць, —*
*ты паедзеш з сумам,*
*Не да цешчы ў госці —*
*на замену гумы.*

Што трэба, тое трэба. Ніхто з тым не спрачаецца: **спадар Юрый Вінаградаў з Докшыцкага раёна** проста канстатуе факт:

*Завядзёнка — на машынах*
*Пад зіму мяняць рызіну...*
*Яно б лепш па халадзіне*
*У валёнках і дзяўчыне:*
*Яе роўненькія ножкі*
*Больш не мерзлі б на дарожках.*

Чыстая праўда (у Аўцюках — сталіцы беларускага гумару — бывае чыстая брахня): у валёнках, ну, вядома ж, цяплей, але...

Грош такі — у ім два бакі: з тога ж канверта і пра тую ж (?) дзяўчыну:

*Вельмі смелая Аленка*
*Паказала ўсім каленкі...*
*Хлопцы*
*елі іх вачамі*
*Не маглі заснуць*
*начамі!*
*А ў Ганны —*
*справы швах:*
*Дзеўка*
*ходзіць у штанах —*
*Ніхто вокам не вядзець,*
*Бо няма на што глядзець.*

Спрэчная выснова, бо штаны цяпер бываюць такія, што ўсе «міні» адпачываюць! (Адна дзяўчына ў такое прыбралася, пакруцілася перад люстэркам, перад хлопцам, пытаецца: «Слухай, калі я нахілюся, трусікі не відаць?» — «Не, — адказвае той, — але магла б і надзець».)

Гэта — вы здагадаліся — быў анекдот. Зноў жа чыстая праўда ад **спадарыні Соф'і Кусянковай з вёскі Лучын, што на Рагачоўшчыне**:

*На гулянку*
*сёння Бэла*
*Порткі-клёшыкі*
*надзела.*
*Гала хітрая была:*
*У чым стаяла,*
*у тым пайшла:*
*Хлопцам,*
*ведала, «у модзе»,*
*Калі голая па «годзе».*

Зрэшты, гэта ўсё — што называецца — за кадрам.

А шкада — у прыватнасці **спадару Аляксандру Матошку з Расоншчыны**:

*Фотку, дзе валёнкі-колы,*
*Хтось абрэзаў для прыколу.*
*Той, хто цалкам бы глядзеў,*
*Далібог, памаладзеў!*

Якраз гэта ўжо і праверана, прытым — найлепшым чынам, то-бок — на сабе: з таго самага «канверта» (у двукоссі, — бо па электроннай пошце):

*Гляджу на боты,*
*ножкі, брук...*
*Як падшыванец,*
*як хлапчук!*
*А за плячыма —*
*голас жонкі:*
*— Пара б табе*
*купіць валёнкі.*

Наша паказка: не заглядвайся на чужых жанок — не скасееш, дык здурнееш. А здурнеўшы, паводле **спадара Івана Янкава з Мінска**, чаго толькі не зробіш:

*Перахоплівае дых,*
*Калі бачыш маладых!..*
*Каб суставы не мяняў,*
*Так, здаецца б, і дагнаў!*

Амаль гэткія ж думкі і ў **спадара Цімошкі з Валожыншчыны**:

*На падворку ў Міколы*
*Бруkаванка і два колы,*
*Ножкі...*
*Шкода — састарэў,*
*Без валёнак бы сагрэў!*

Як той казаў, волас сівее — розум шалее. Ну дагнаў (паводле спадара Янкава — з рызыкай для суставаў, а то і жыцця), ну сагрэў: далей — болей, як той казаў, а вось лепей ці не — пытанне.

Адказ ад класіка:

*Мы гэткіх шлюбаў*
*многа знаем:*
*На кветках жэняцца карчы.*
*І тым карчам мы спачуваем,*
*Але не можам памагчы.*

Зрэшты, мы крыху адхіліліся: час вярнуцца да нашых бараноў, то-бок да здымка — з валёнкамі, коламі, дзеўкамі: чаго яны там стаяць, ляжаць ды ходзяць, дакладна ведае **спадарыня Войцік з Гродна**:

*Гаспадар тут!*
*І «з вусамі»:*
*Колы — памяняў на сані,*
*Зараз — боты*
*на валёнкі...*
*Вось і до...*
*Трымайся жонкі!*

Добрая парада!

Пра тое ж, толькі здалёк і гледзячы на здымак, — **спадар Мікалай Старых з Гомеля**:

*Янка ўвосень сані*
*ўзяўся рыхтаваць —*
*Колы без патрэбы*
*на траве ляжаць.*
*Нейкі Бураціна*
*выставіў валёнкі...*
*Ды шыбуе міма*
*дзеўка-незнаёмка,*
*Бо, падобна, з ёю*
*ідзе яе жаніх?*
*...Я, здаецца, сцяміў,*
*што «звязала» ўсіх:*
*І разгадка, людцы,*
*простая такая:*
*Кожны на тым здымку*
*пару сваю мае.*

А вось як знаходзіць, — пытанне.

Спроба адказу ў лісце **спадара Валерыя Гаўрыша**, які, гледзячы на здымак, міжволі ўспомніў нашу класіку і, вядома ж, Класіка — Янку Купалу. Данінай павагі яму радкі:

*У гэткім строі*
*на хвілінку*
*Не ўяўляецца*
*Паўлінка!*
*Яе б*
*Якім не пакахаў...*
*Быкоўскі б —*
*хіба пакатаў...*
*Вось толькі б*
*сватацца ці стаў?*

Пра тое ж толькі іншымі словамі **спадарыня Любоў Чыгрынава з Мінска**:

*Зранку ўдумала Маруся*
*Стаць какеткаю-спакусай,*
*Агаліла ножкі файна...*
*Ні спакусы ўжо,*
*ні тайны.*

Бывае: хацела, мусіць, як лепей, атрымалася, як заўсёды. І каб толькі ў Марусі, а то ж (паводле **спадара Мікалая Касмачэўскага з Наваполацка**):

*Прапануюць дзеўкі смела*
*Скарыстацца іхнім целам,*
*Але ўсё ж, зазначыць мушу:*
*Людзі болей*
*цэняць душы.*

Што яшчэ? Ды відавочна, як лічаць **сужэнцы Астроўскія з Мінска**:

*Тут —*
*музей пад чыстым небам...*
*Нам такія*
*вельмі трэба,*
*А то ж возьмем ды забудзем,*
*Як жылі калісьці людзі...*
*У цяжкай працы,*
*у горкім горы*
*Агаляцца?*
*Ганьба! Сорам...*
*На вазах усё вазілі,*
*У валёначках фарсілі...*
*Дай бог, помніць, разумець,*
*Гэта значыць — розум мець!*

У Аўцюках вельмі трапна казалі: не лічы сябе разумным — будзь ім!

Гэтым прыгожым заклікам можна было б завяршыць сённяшні агляд, але ж ёсць у пошце яшчэ адзін — і не менш патрэбны. Як піша **спадар Янкаў**:

*Я за модай не ганюся —*
*Мне яе*
*не даганяць...*
*Я да моладзі звярнуся,*
*Каб адно ёй пажадаць:*
*Ёсць галовы ў вас і сіла,*
*Можна шчасце будаваць...*
*Толькі б розуму хапіла*
*У міры жыць, не ваяваць!*

Актуальнае пажаданне! А ўжо на фінішы года... Анекдот: «Фіма, ты ўжо нешта купіў да святочнага стала?» — «Такі-так!.. Адну бутэлечку белага віна, адну баначку чырвонай ікры і многа семак». — «Ой-вэй, а навошта?» — «Віно — каб выпіць, ікру — каб закусіць, а семкі — для таго, каб напляваць на ўсе магчымыя цяжкасці!»

Вось гэтага — аптымізму — хацелася б пажадаць усім чытачам «Звязды», усім удзельнікам конкурсу «Хто каго?».

А напрыканцы яшчэ і нагадаць, што на папярэднім здымку (гл. «Звязда», 25 кастрычніка г. г.) былі аматары плавання (на прыгожай рацэ, на мастках...) і найлепшыя радкі пра іх склалі **мінчанка Любоў Чыгрынава і Валянціна Гудачкова з Жыткавічаў, спадары Іван Янкаў з Мінска, Віктар Сабалеўскі з Узды, Мікалай Камароўскі з Оршы, Аляксандр Матошка з Расоншчыны**.

Вось з гэтым, апошнім меркаваннем многіх чытачоў, пагадзілася і журы маленькае рэдакцыйнае.

Такім чынам, прыз у выглядзе падпіскі на дарагую сэрцам газету на першы квартал 2024 года накіроўваецца ў вёску Янкавічы Расонскага раёна.

Хочаце, каб родная газета на роднай мове пяць разоў на тыдзень прыходзіла і да вас, тады варыянтаў два: першы — своечасова аформіць падпіску (на месяц, на два, на квартал ці паўгоддзе), другі — уважліва паглядзець на чарговы конкурсны здымак (унізе), прыдумаць подпіс (можна некалькі, але трапных, дасціпных, каротких (пажадана — не больш за восем радкоў) і даслаць у рэдакцыю.

Шанс на выйгрыш мае кожны.

**Валянціна ДОЎНАР.**

***Ад яе ж** шчырыя прабачэнні ўсім, чые варыянты не трапілі на старонкі газеты — на гэты раз. Затое ў наступны...*

*Адзінае — пры ўмове, што аўтары будуць не толькі нешта пісаць, рыфмаваць, але і перачытваць тое, што атрымалася, думаць: а ці добра ж, ці ўдала, ці нельга лепей? То-бок — трошкі працаваць.*

*Усім, хто гэта рабіў, робіць і нават хацеў бы ў новым 2024-м — найшчырэйшы дзякуй! Ад чытачоў — таксама! З надыходзячым! І пішыце!*



# ООО «Фрондера» извещает о проведении публичных торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества ООО «Профитсистем»

| Лот | Наименование | Начальная цена с учетом НДС 20 %, бел. руб. | Задаток, бел. руб. | Шаг аукциона, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Станок строгальный четырехсторонний Profimat 23E (WEINIG), инв. № 44502024 | 44 940,00 | 4494,00 | 2247,00 |
| 2 | Стреппинг-машина TP-6000-1, инв. № 4016004 | 7308,00 | 730,80 | 365,40 |
| 3 | Автопогрузчик HC CPCD35N-RW (зав. № FYAF20843, двиг. № 463618), инв. № 50426585 | 46 848,00 | 4684,80 | 2342,40 |
| 4 | Автопогрузчик HC CPCD35N-RW33, (2018 г. в.), трехсекц. мачт 3000, вилы 1070 мм, инв. № 41716002; радиостанция автомобильная President Henry ASC 24/12 (Франц.), (45625025) к инв. 41716002, инв. № 45625025 | 44496,00 | 4449,60 | 2224,80 |
| 5 | Автопогрузчик HC CPCD35N-RW56,2018 г. в., инв. № 41716001; радиостанция автомобильная President Henry ASC 24/12 (Франц.), (45625026) к инв. 41716001, инв. № 45625026; система взвешивания и индикации веса для погрузчика, инв. № 47052001 | 65 328,00 | 6532,80 | 3266,40 |
| 6 | Автопогрузчик HC CPCD35N-RW13 (стал. каб. с отоп., каретка, мачта V3000), инв. № 50426365; радиостанция автомобильная President Henry ASC 24/12 (Франц.), (45625027) к инв. 50426365, инв. № 45625027 | 41 328,00 | 4132,80 | 2066,40 |
| 7 | Форвардер «Valtra 6750, гос. номер AK1 8801, инв. № 50080; полуприцеп лесовозный Palms 13D, 2020 г. в., сер. № 21819, Гос. ном. АМ-1 4496, инв. № 50414006 | 107 136,00 | 10713,60 | 5356,80 |
| 8 | Щётка дорожная БелДТ-5002 Ф2, инв. № 50426447 | 12 576,00 | 1257,60 | 628,80 |
| 9 | Платформа транспортная 2ПТТ-918 инв. № 41008 | 3936,00 | 393,60 | 196,80 |
| 10 | Полуприцеп тракторный самосвальный ППЩ28, инв. № 50413004 | 43 968,00 | 4396,80 | 2198,40 |
| 11 | Станок для разделки углов в бревнах (инв. № 60100), рольганг (18м) (инв. № 50426372) | 41 280,00 | 4128,00 | 2064,00 |
| 12 | Автопогрузчик HC CPCD35-AW55, рама G5BAK1729, 2021 г. в., инв. № 41716005 | 53 856,00 | 5385,60 | 2692,80 |
| 13 | Вилочный автопогрузчик дизельный EP CPCD40 T8, № 528160167, 2019 г. в., инв. № 41717002 | 74 208,00 | 7420,80 | 3710,40 |
| 14 | Форвардер «Valtra 6750» гос. номер OK-5 2581 (инв. № 50073) с гидроманипулятором Palms 5,72 (A4 HS BR2 серийный № 25486) 2020 г. в. (инв. № 41716004) | 133 440,00 | 13 344,00 | 6672,00 |
| 15 | Привод УМ, Т-80 к трактору, инв. № 70270 | 2400,00 | 240,00 | 120,00 |
| 16 | Форвардер «Valtra 6750» № 72-60 OA (50081), гос. номер OM-5 8399, инв. № 50081 | 78912,00 | 7891,20 | 3945,60 |
| 17 | Форвардер «Valtra 6750», гос. номер OB-5 09-20, инв. № 70210 | 88 800,00 | 8880,00 | 4440,00 |
| 18 | Форвардер «Valtra 6750», гос. номер 5019 AB, инв. № 50074 | 78 912,00 | 7891,20 | 3945,60 |
| 19 | Форвардер «Valtra 6750» №71-70 OA, гос. номер OM-5 8405, инв. № 50079 | 78912,00 | 7891,20 | 3945,60 |
| 20 | Харвестер «Valtra-X120 Forester» 72-63 OA, гос. номер OM-5 8401, инв. № 50084 | 115 200,00 | 11520,00 | 5760,00 |
| 21 | Харвестер «Valtra-X120 Forester», гос. номер AM-1 2174, инв. № 50082 | 115 200,00 | 11520,00 | 5760,00 |
| 22 | Харвестр Valtra x120 F -лайн (Кето 51+Мотомит ИТ) гос. номер OK-5 0575, инв. № 50426027 | 115 200,00 | 11520,00 | 5760,00 |
| 23 | Автомобиль MAZ-631708-364-000P1 с гидроманипулятором Майман MM100-03, гос. номер AC 0964-5, инв. № 50408001; Прицеп МАЗ-892620-010 № Y3M892620J0000448, A 3706 E-5 к AC 0964-5, инв. № 50414001 | 171 072,00 | 17107,20 | 8553,60 |
| 24 | Прицеп МАЗ-857102-(010), инв. № 50426267 | 26 304,00 | 2630,40 | 1315,20 |
| 25 | Автомобиль МАЗ 5440B9, шасси Y3m544B9F0001057, инв. № 50426473; полуприцеп бортовой тентовый KOEGEL SN24P, инв. № 50426501 | 60 960,00 | 6096,00 | 3048,00 |
| 26 | Автомобиль-сортиментовоз АСК-18А КАМАЗ (гос. ном. AC 8538-5), инв. № 50426445; Прицеп-сорт-воз A0883E1 T8302A VIN127 Ф1, инв. № 50426461 | 145 728,00 | 14572,80 | 7286,40 |
